КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 28 (1154) 12 ліпеня 2014 г.

Дыплом і пасля дыплома С. 2—3

"На маю думку": **шэсць меркаванняў** С. 4—5

Дырэктар фестывалю ведае пра... С. 7

Беларускі тэатр вачыма **француза** С. 13

Колеры Альгерда. Малішэўскага С. 15

ВІЦЕБСК-2014: А КОЛЬКІ ЎСЯГО ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ!..

Фота Сяргея СЕРАБРО

Толькі за першыя дні "Славянскага базару ў Віцебску" запалілася новая зорка на Алеі ля Летняга Амфітэатра, адбыліся ўручэнні шматлікіх узнагарод, канкурсанты прайшлі паўфінальныя выступленні, зладзілася нямала запамінальных канцэртных праграм, не абышлося без прыемных адкрыццяў ад народных майстроў. І гэта толькі за першыя колькі дзён...

С. 2, 6, 8

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Праекты развіцця

Брама неўміручасці, або Прыгоды гарынскай цэглы

Бярозаўскі раён: аптымізацыя, памяць, рэстаўрацыя…

Апошні дзень нашай аўтакамандзіроўкі, так ужо атрымалася, быў прысвечаны культуры Бярозаўшчыны і ўласна Бярозы. На старадаўнім гербе яе красуецца брама кляштара ордэна картэзіянцаў. Наяве яна пакуль не такая прыгожая. Тым не менш, па-ранейшаму сімвалізуе заможнасць кляштара, што дасягнуў у XVII стагоддзі не толькі духоўных, але і эканамічных вышынь — за кошт развіцця крэдытавання, гандлю ды рамёстваў. А сімвал, звернуты да нашчадкаў, павінен існаваць вечна, нагадваць, абуджаць, клікаць... З дадзенай нагоды ўхвальна, што мясцовыя ўлады вырашылі аднавіць адмысловую пабудову і пераўтварыць яе ў гэткую Браму неўміручасці, што адкрывае нам выбітнасць тутэйшай гісторыі і культуры. Вось да той Брамы мы і імкнуліся цягам усяго дня. На шляху, трэба сказаць, сустрэлі безліч цікавага і карыснага для нас ды чытачоў.

Яўген РАГІН і Кастусь АНТАНОВІЧ
Мінск — Мінская — Гродзенская — Брэсцкая вобласці — Мінск

Закрываць ці не?

Ранак пачалі, натуральна, з візіту да начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бярозаўскага райвыканкама Таццяны Кавалёк. Знаходзіцца аддзел у будынку ДШМ, які актыўна рамантуецца. Гаварылі пра набалелае: пра аптымізацыю. Па словах Таццяны Кавалёк, цягам мінулага года ў раёне былі закрыты тры бібліятэкі. Адна з іх месцілася ў вёсцы Горск, дзе засталося менш за шэсцьдзясят жыхароў. Неўзабаве там будзе скасаваны і сельскі клуб… Працягваецца інтэграцыя бібліятэк. Так, школьная ўстанова ў вёсцы Падкраічы далучылася да публічнай. Па такім жа прынцыпе будуць інтэграваны яшчэ сем бібліятэк.

Словам, гучала ўжо звычайная для нас фактура. Установы закрываюць, інтэгруюць, але працэс ідзе павольна ды стрымана. І гэта таксама добра зразумела: справа — новая, і пры паспешлівасці тут можна і дроў наламаць. Тым больш, што відавочнай грашовай эканоміі, як ні падлічвай, працэс пакуль не дае. А бібліобус з аўтаклубам, як перакананы кіраўнікі бярозаўскай культуры, усе пытанні якаснага абслугоўвання насельніцтва ну ніяк не закрыюць. Дык, урэшце, адкажыце, каму выгадна нявыгадная аптымізацыя? У нас у 118 раёнах Беларусі — 118 "рэцэптаў" аптымізацыі, інтэграцыі і мінімізацыі. Кепска тое ці добра? Вельмі не хацелася б, каб на гэтае пытанне адказвалі не спрактыкаваныя спецыялісты, а час. Ён, як вядома, не зважае на патрэбы культуры, а проста беззваротна мінае…

Закранулі і яшчэ адну "болевую кропку" — магчымасць павелічэння заробкаў работнікаў культуры, якія па максімуме выкладваюцца на працы. Нам патлумачылі, магчымасці гэтыя ёсць і актыўна выкарыстоўваюцца. Акрамя даплат з пазабюджэтных сродкаў, згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 29 ад 26.07.1999 года, у якасці заахвочвання работнік можа атрымаць да кантракту да 50 працэнтаў ад акладу. Пагадзіцеся, добрая дабаўка, улічваючы, што сярэдні заробак работніка культуры ў Бярозаўскім раёне складае тры з паловай мільёны рублёў. Цікава іншае: бібліятэкар з вышэйшай адукацыяй атрымлівае, вядома ж, больш, чым яго менш адукаваны калега. А вось сярод работнікаў клубных устаноў узровень адукацыі не адбіваецца на заробку…

Лячыцца ад стрэсаў

Даўно не закраналі тэму развіцця школ мастацтваў. Таму сустрэча з кіраўніком Бярозаўскай ДШМ Ірынай Шуляк была прадвызначана. Ірына Рыгораўна трымаецца спакойна і з гонарам. Словам, нават знешнім выглядам ды паводзінамі абвяргае думку, што ў мясцовай школы мастацтваў могуць быць праблемы. "Ёсць толькі пытанні, якія мы вырашаем!" Так. Яшчэ тры гады таму ва ўстановы быў недабор вучняў, бралі кожнага, сёлета ж — ужо конкурс. Як усё атрымалася? Ды проста! За кошт рэкламных абыходаў, ад якіх баляць ногі, і дзякуючы асабістаму прафесіяналізму, ад якога баліць галава. Нармальныя выдаткі любога творчага працэсу…

Пра аспекты развіцця культуры ў раёне чытайце **на старонках 10 — 11.**

Зорку народнай артысткі Расіі **Надзеі Бабкінай** "запалілі" ў Алеі лаўрэатаў спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Беларусі.

Афіцыйна

Масты дружбы

На думку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, якую ён выказаў пад час адкрыцця форуму, Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" не страчвае стрыжань і ядро — мастацтва брацкіх народаў Расіі, Беларусі і Украіны, якія стаялі ля яго вытокаў, і адну з галоўных ідэй: з дапамогай мастацтва наводзіць масты дружбы паміж людзьмі і садзейнічаць захаванню нацыянальнай разнастайнасці.

Нагадаўшы пра тое, што форум праходзіць дваццаць трэці раз, Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што за гэтыя гады ў свеце не раз мянялася мода на мастацкія напрамкі і стылі: "Сцерліся з памяці нямала праектаў, якія спачатку гучна заявілі аб сабе. А наш "Славянскі базар", што пачынаўся са сціплага песеннага конкурсу, вырас у сапраўдную творчую Алімпіяду, дзе дэманструюць свае дасягненні прадстаўнікі розных відаў мастацтва".

На думку беларускага Лідара, крыніцай сілы і энергіі фестывалю з'яўляецца славянская культура — адна з самых старажытных, самабытных і багатых на Зямлі, якая ўвабрала ў сябе традыцыі Усходу і Захаду, захавала інтэлектуальную і духоўную спадчыну пакаленняў.

"Група славянскіх народаў — самая вялікая ў Еўропе. І, як бы ні складваўся лёс канкрэтных этнасаў, у крытычныя моманты гісторыі адзінства славян заўсёды праяўлялася. Гэта актуальна сёння. І я ўпэўнены, што трэба дастаць гэтыя струны душы і праявіць гэта славянскае адзінства, — падкрэсліў Лукашэнка. — Нашы продкі не бачылі сябе паасобку, не шукалі варожасці, а вышэй за ўсё цанілі верную дружбу".

"Славянскі базар" — адно з тых месцаў, дзе мы можам яшчэ раз пацвердзіць сваё імкненне быць разам. Свята берагчы шматвяковыя вузы, якія звязваюць нас, заснаваныя на агульнасці гістарычных шляхоў, блізкасці моў і культур", — лічыць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на фестывалі рады бачыць прадстаўнікоў розных кантынентаў, краін і народаў. Праект даўно выйшаў за рамкі толькі славянскага форуму. З кожным годам ён пашырае мастацкія і, што немалаважна, геаграфічныя межы. Гэтымі днямі на фестывальных пляцоўках выступяць прадстаўнікі 29 краін, з'явіцца нямала маладых талентаў, прэм'ерных праектаў і новых праграм.

"Уласцівыя славянам ветлівасць і гасціннасць у многім вызначаюць непаўторнае аблічча фестывалю і садзейнічаюць росту яго папулярнасці ў свеце. Гэта свята для ўсіх, хто сваёй творчасцю робіць жыццё прыгажэйшым і дабрэйшым. Для ўсіх, хто ўмее цаніць прыгажосць, талент і арыгінальнасць", — падкрэсліў беларускі Лідар.

Уручаючы спецыяльную ўзнагароду "Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення" народнай артысткі Расіі Надзеі Бабкінай Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што гэта ўзнагарода дастаецца лепшым. Надзея Бабкіна падзякавала за аказаны давер, адзначыўшы, што вельмі рада ўзнагародзе. Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў прэміі Саюзнай дзяржавы, якой удастоены выдатны скульптар Іван Міско і вядомы даследчык архітэктуры Інэса Слюнькова.

У час наведвання фестывалю Прэзідэнт адзначыў шэраг кірункаў для працы Міністэрству культуры. "Калі ў нас робіцца нумар, ён павінен быць не горшым, чым аналагічны ў свеце, і па харэаграфіі, і па вакале, і па музыцы, і па аранжыроўцы. У адваротным выпадку, навошта рабіць?" — лічыць Кіраўнік дзяржавы. "У нас што, няма экспертаў, якія скажуць: не, не пойдзе, гэта не сусветны ўзровень? Ёсць. А адносіны — добра, пойдзе", — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што любы канцэрт павінна аб'ядноўваць цэласная канцэпцыя, ён не павінен уяўляць сабой выступленне асобных артыстаў.

Прэзідэнт закрануў і такі аспект, як выступленне артыстаў пад фанаграму. "Добра, ты даеш канцэрт дзве з паловай гадзіны, скачаш, трэба недзе перадыхнуць — нешта паставіш пад фанаграму. Але калі ты спяваеш толькі дзве песні, то можна выйсці, калі ты сапраўды артыст, і спець ужывую", — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт лічыць, што ў краіне гэтымі пытаннямі займаюцца ад выпадку да выпадку, падкрэсліўшы, што павінна быць пастаянная планамерная работа па павышэнні майстэрства артыстаў.

Паводле паведамленняў Прэс-службы Прэзідэнта

Каму пасля дыплома

Летась "К" даволі падрабязна распавядала пра абароны дыпломаў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, а таксама ў сталічных ВНУ, якія маюць факультэты дызайну (гл. "К" № 34 за 2013 г.). Уласная інфармацыя суправаджалася каментарыямі спецыялістаў. Калі памятаеце, нашы суразмоўцы, увогуле станоўча характарызуючы стан падрыхтоўкі дызайнераў, не абмінулі, аднак, і наяўнасці праблем у гэтай сферы. Водгукі ж на тую публікацыю аказаліся неадназначнымі: нехта палічыў за станоўчую з'яву такі разбор, іншыя, наадварот, не жадалі б выносіць справу па-за межы аўдыторыі.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Амбіцыі і... эканоміка

А праблемы ж тыя наўпрост звязаны з сітуацыяй у эканоміцы. Напрыклад, прывабнасць такой спецыяльнасці, як "Дызайн сродкаў транспарту", сярод абітурыентаў не надта высокая. Дызайн як з'ява даўно пазбавіўся рамантычнага флёру — сёння ў ім дарэчны творчы прагматызм. І прагматычная моладзь добра дасведчаная адносна запатрабаванасці грамадствам тых або іншых прафесій. А тое, што сёння ў беларускім машынабудаванні не надта спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі дызайнерскіх амбіцый, для спецыялістаў не сакрэт. Гэтак мы паступова можам і школу праектавання страціць…

Сёлетнія дыпломы дызайнераў БДАМ па транспартнай тэме былі даволі якасныя, але закладзеныя ў іх ідэі не будуць скарыстаны прамысловасцю. Гэта — выключна папяровы дызайн. Верагодна, што больш пашчасціць тым, хто абараняўся па тэматыцы "Дызайн быту".

Віртуальных стала шмат

Дарэчы, невыпадкова ў недзяржаўных ВНУ, дзе ступень адаптаванасці працэсу навучання да патрэб рынку прафесій досыць высокая, дзе студэнты са сваёй кішэні плацяць за веды, з якіх потым збіраюцца бязбедна жыць, сярод гэтага кірунку спецыяльнасцей дамінуе "Дызайн віртуальнага асяроддзя". Атрымаўшы такі дыплом, можна стаць праграмістам, распрацоўваць камп'ютарныя гульні, засяродзіцца на анімацыі, знайсці сябе ў рэкламнай сферы. Адна з недзяржаўных ВНУ сёлета выпусціла на рынак працы аж пяцьдзясят спецыялістаў у сферы віртуальнага дызайну, тым часам як у Акадэміі звыклая лічба па кожнай з дызайнерскіх спецыялізацый — да дзесяці дыпломнікаў. Складваецца ўражанне, што дызайн у нашай краіне са сферы рэальнай вытворчасці ўсё больш перасоўваецца ў віртуальную сферу, у яе забаўляльны сегмент.

Сёлета ў БДАМ я бачыў абарону згаданых "віртуальшчыкаў" і дызайнераў-графікаў. Па сэнсе гэта даволі блізкія прафесіі. Але першыя прэзентуюць нейкую з'яву, падзею або прадмет у дынамічнай форме — праз анімацыю ці нават пастановачнае відэа, — а другія малююць на паперы. Праўда, "малююць" таксама з дапамогай камп'ютара. Адных камп'ютар у пэўным сэнсе разбэшчвае, бо стварае ілюзію, што тэхніка заўжды вывязе, што з дапамогай камп'ютар-

Дызайн-праект культурна-сацыяльнай акцыі "Ведай сваё" Лізаветы Емільянавай (БДАМ).

фотафакт

Каго не дачакаліся...

У Слоніме на вуліцы Пушкіна адкрылі помнік слонімскім юнакам, якія загінулі ў Афганістане. Гэта Уладзімір Комлеў (1962 г. н.), Мікалай Кузьміцкі (1962), Сяргей Мыслівец (1967), Анатоль Скок (1966), Іван Ясюкевіч (1957) і Анатоль Супрун (1957). Усіх іх бацькі і землякі не дачакаліся з войска… Аўтар помніка — беларускі скульптар Уладзімір Церабун. Ён ужо стварыў помнікі афганцам у Смаргоні і Лагойску. Памятку слонімскім воінам-афганцам 3 ліпеня ўстанавілі побач з помнікам воінам, якія загінулі ў час Другой сусветнай вайны. На новы твор пайшло 280 кг бронзы.

Сяргей ЧЫГРЫН / Слонім / Фота аўтара

Рэпліка пра.

…Генадзя Бураўкіна

Сяргей ЧЫГРЫН, загадчык літаратурнай часткі Слонімскага драматычнага тэатра

Не стала Генадзя Бураўкіна. Не стала народнага паэта, якога мы моцна любілі. Любілі яго як чалавека, як паэта, як грамадскага дзеяча, любілі яго як старэйшага сябра і дарадчыка. А ён любіў нас, маладых хлопцаў і дзяўчат, асабліва тых, хто жыве ў рэгіёнах Беларусі, хто піша па-беларуску, хто працуе на Беларусь, ганарыўся намі, паважаў нас.

Калі ён са мной сустракаўся, шчыра абдымаў мяне, ціснуў руку і казаў вельмі шчырыя словы падзякі за ўсё і за ўсіх, бо хто цябе пахваліць у правінцыі?.. Ды ніхто. А Генадзь Мікалаевіч рабіў гэта ад сэрца, па-бацькоўску цёпла, і адчувалася ў яго вачах радасць за нас. Ён ніколі не пытаўся ў мяне: над чым ты цяпер працуеш? Ён радасна казаў: "Чытаў твой матэрыял, чытаў! Маладзец!.." І гэтых слоў мне хапала да наступнай сустрэчы…

І хоць сустрэч з Генадзем Мікалаевічам у мяне было менш, чым у тых, хто з ім жыў у Мінску, мне адчувалася, што ён больш хіліўся да тых, хто жыў далёка ад сталіцы, хто за некалькі соцень кіламетраў прыязджаў сюды не так часта. "Ты, Сяргей, са Слонімскага раёна, а я — з Расонскага. Але памятай, што ёсць прыгожае слова "правінцыя", дзе можна тварыць лепш, чым у сталіцы", — казаў Генадзь Мікалаевіч. Гаворачы пра Слонімскі і Расонскі раёны, ён чамусьці пры вымаўленні вылучаў літару "С". А сам усміхаўся і пачынаў распавядаць пра ўсе навіны літаратурнага жыцця ў беларускай сталіцы. На пытанні мае адказваў хутка і сам адразу свае адказы каментаваў. І яго было слухаць вельмі цікава. Таму пасля сустрэч з ім я вяртаўся дамоў нейкім натхнёным, творча і духоўна ўзбагачаным, што хацелася жыць і працаваць, працаваць!..

Яго сябра — прафесар Алег Лойка (1931 — 2008) апошнія гады жыцця пражыў у Слоніме. Я часта з ім сустракаўся, шмат гутарыў, шмат у нас было творчых планаў ды мар. І калі мы нешта задумвалі з Алегам Антонавічам, ён папярэджваў: "Трэба параіцца з Генадзем". З Генадзем Бураўкіным яны былі добрыя сябры. Таму Алег Лойка шмат пра яго ведаў, распавядаў, асабліва пра той час, калі ён з'яўляўся старшынёй Дзяржтэлерадыё БССР і пастаянным прадстаўніком Беларусі ў ААН.

Цяпер ужо няма гэтых вялікіх людзей нашай Бацькаўшчыны. Адыходзяць беларускія аксакалы — паважаныя, таленавітыя, умудроныя жыццём людзі. Адным з такіх быў і Генадзь Бураўкін — найвыдатнейшая АСОБА зямлі беларускай. Дзякуй Вам за ўсё, дарагі Генадзь Мікалаевіч!..

…радыёпастаноўку рамана "Млечны шлях" Кузьмы Чорнага

Таццяна ІГНАТОВІЧ, пенсіянерка:

— На Беларускім радыё нядаўна "паказалі" аповесць "Млечны шлях" Кузьмы Чорнага. Высокую філасофскую ноту твора філігранна адлюстравалі Генадзь Аўсяннікаў, Віктар Манаеў, Алег Вінярскі, Марыя Захарэвіч, Аляксандр Ждановіч, Віктар Мішчанчук, Арнольд Памазан, Андрэй Душачкін, Мікалай Кірычэнка, Аляксандр Гарцуеў… Рэжысёр — Алег Вінярскі… "Млечны шлях" — эпахальны твор. У ім аўтар узняўся да высокамастацкага абагульнення агульначалавечых каштоўнасцей. Адна з асноўных — мірнае стваральнае суіснаванне народаў і нацый. Пагадзіцеся, у нашым свеце, які ніяк не можа пазбавіцца ад разбуральных войнаў, гэтае пытанне становіцца ці не самым актуальным…

Што каментуюць чытачы ў Сеціве?..

"Аўтапрабег: фініш — вынікі" / № 17

Людмила Захаревич:

"Дзякуй, Яўген і Кастусь, за цікавы, павучальны і пазнавальны артыкул! Усё справядліва і дальнабачна. Мае роздумы

24 тысячы гледачоў пабывалі на выстаўцы "Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі" ў Нацыянальным мастацкім музеі.

Сцісла пра работы дызайнераў-2014 у нашых ВНУ

камфортна?

Фірменны стыль беларускай чыгункі, распрацаваны Алесяй Дэр (БДАМ).

ных праграм можна зрабіць/ скампанаваць/ скампіляваць нешта вартае ці, самае малое, — вонкава прывабнае, не прыкладаючы разумовых намаганняў. Летась мне давялося быць кіраўніком дызайнерскага дыплома ў адной з мінскіх ВНУ. На маю заўвагу "У вас па дыпломе нічога не зроблена, а да абароны засталося *ўсяго* два месяцы", мой падапечны адказаў: "У мяне яшчэ *цэлыя* два месяцы!" Каментарыі тут залішнія. Ад знаёмых выкладчыкаў я ведаю, што падобныя настроі сярод дыпломнікаў — не такая ўжо рэдкасць.

Анімацыя для…

Але, у іншым выпадку, калі чалавек ведае, чаго хоча, камп'ютар — гэта цудоўны інструмент, які дазваляе істотна скараціць марудную падрыхтоўчую стадыю, сэканоміць каштоўны час для працы творчай. У гэтым я пераканаўся на прыкладзе абароны дыпломаў "віртуальшчыкамі" па тэме "Спадчына Беларусі". Такіх дыпломаў было два: анімацыйныя ролікі "Палац у Белавежы" і "Быхаўскі замак". У некалькі хвілін анімацыі былі ўціснуты асноўныя гістарычныя падзеі, што паўплывалі на лёс і аблічча згаданых помнікаў архітэктуры. Цудоўна перададзена атмасфера часу, які ўвасоблены ў архітэктуры палаца і замка. Лёгка ўявіць, што згаданыя дыпломы знойдуць месца ў інтэрактыве музейных экспазіцый.

Спрыяць засваенню падлеткамі ведаў па геаметрыі мог бы прадстаўлены на абароне анімацыйны ролік па гэтым прадмеце. Пры наяўнасці адукацыйнай функцыі дадзеная работа можа ўспрымацца як узор чыстай, абстрагаванай эстэтыкі, гэткага "мастацтва дзеля мастацтва".

Анімацыя паводле традыцыйнай беларускай харэаграфіі даводзіць, што нашы танцы такія ж прывабныя, як і раскручаныя сусветныя брэнды ў гэтай галіне.

Запомніўся таксама адзін з дыпломаў дызайн-графікі пад назвай "Ведай сваё". Гэта серыя паштовак, на якіх у дасціпнай форме праілюстраваны цікавыя факты з гісторыі Беларусі ды яе рэчаіснасці. Прадстаўленае на дыплом датычылася Мінска і Беларусі ўвогуле, але падобны праект можна рэалізаваць у кожнай вобласці, раёне, у кожнай вартай увагі кропцы на карце нашай краіны. Каб дасылаў турыст дадому паштоўку не з краявідам мясцін, а з графічным адлюстраваннем факта, які робіць гэтыя мясціны адметнымі…

Сваё і "сваё"

Дыпломная работа "Фірменны стыль Беларускай чыгункі" наўрад ці будзе ў бліжэйшы час рэалізавана, тым больш, што сённяшні знак-лагатып БЧ (яго, дарэчы, у 1990-х стварыла мая аднакурсніца Тамара Жаркевіч) добра выконвае сваю функцыю. Але на некаторыя закладзеныя ў ім ідэі варта звярнуць пільную ўвагу. У прыватнасці, нацыянальны каларыт установам і структурам Беларускай чыгункі надалі б прапанаваныя аўтарам піктаграмы, выкананыя на падставе стылістыкі нацыянальнага ткацтва.

Як бачыце, арыентацыя на нацыянальную эстэтыку, на беларускія рэаліі трывала замацавана ў праграме навучання дызайнераў у БДАМ.

Як і ва ўсіх мінскіх ВНУ, вучацца ў Акадэміі студэнты з Кітая. У тым ліку — на факультэце дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Быў сёлета на дызайн-графіцы і кітайскі дыплом. Уражвае тое, што кітайцы, засвойваючы беларускую школу дызайну і выяўленчага мастацтва, тэматычна застаюцца вернымі сваёй радзіме. Вось і згаданы дыплом зместам і стылістыкай прапагандаваў кітайскую культуру. Гэта была візуальная канцэпцыя кнігі па гісторыі развіццця і трансфармацыі стрыжнявых іерогліфаў кітайскай мовы.

Сёлетнія дыпломы спецыялізацыі "Фотаграфіка" мне запомніліся падкрэсленай функцыянальнасцю і тэхналагічнасцю. Яны зроблены так, што іх можна адразу несці ў друкарню ды тыражаваць.

Эфект прэзентацыі

Бачыў я сёлета і дыпломы адной з недзяржаўных ВНУ. У мяне склалася ўражанне, што, пры падабенстве навучальных праграм і методык, недзяржаўныя ВНУ, у адрозненне ад БДАМ, больш увагі надаюць не матывацыі, не лагічнаму абгрунтаванню таго або іншага дызайн-праекта, а тэхнічнаму выкананню і эфектнаму прадстаўленню работы. Калі-нікалі гэта спрацоўвае, а бывае, што адсутнасць канцэптуальнага грунту надта ж муляе вока…

Але яшчэ невядома, каму пасля дыплома ў рэальным жыцці будзе больш зручна і камфортна: таму, хто задае шмат пытанняў, перш чым распачаць працу, ці таму, хто, маючы ў творчым арсенале дваТры эфектныя прыёмы, дзве-тры канструктыўныя схемы, проста падладжваецца пад не заўжды выхаваны густ замоўцы. Зрэшты, пры тым велізарным матэрыяльным абшары, які дызайнерам належыць акультурыць, справа знойдзецца спецыялістам рознага менталітэту, таленту і творчых схільнасцей.

К

наконт злашчаснай аптымізацыі, якую распачалі ў сельскай мясцовасці, добра падмацоўвае адзін сказ у вашым артыкуле: "А бібліобуса ў Харашках увогуле не бачылі. Ці ж такім чынам варта праводзіць аптымізацыю сеткі ўстаноў культуры?". І так будзе паўсюдна: то бензіну няма, то бібліобус зламаецца… А людзі так і будуць сядзець у сваіх маленькіх вёсачках, удалечыні ад музеяў, палацаў, бібліятэк, клубаў? Сумна, затое эканомна".

"Музеі, якія ёсць і якіх… няма" / № 25

Nata Svirido:

"Згодная з меркаваннем Кастуся Антановіча. Але магу дадаць: нават тыя музеі, што ёсць, маюць шэраг нейкіх недарэчнасцей, за якія сорамна. Толькі што 28 чэрвеня з калектывам наведвалі Музейны комплекс "Дудуткі". Незразумела, чаму экскурсіі для беларусаў пра традыцыі беларускай культуры праводзяцца на рускай мове, чаму на тэрыторыі шмат турыстаў у стане моцнага алкагольнага ап'янення (хоць многа побач дзяцей з бацькамі), чаму непрадуманы дызайн (кветкавы) на тэрыторыі, і г.д. Там былі замежныя госці, і мне за гэтыя ды некаторыя іншыя рэчы, пра якія не пішу, было сорамна. Гэта крыху сапсавала пазітыўнае агульнае ўражанне. Маёнтак Каробчыцы пад Гроднам лепш выглядае ў сэнсе турыстычных магчымасцей, хоць і не такі па аб'ёме ды змесце экспазіцый…"

"Веласіпеднае" вырашэнне" / № 24

El Rybchinskaja:

"Галоўная з іх, як лічыць бібліёграф, у тым, што грамадства стала менш чытаць. Пра гэта і будзе весціся гаворка ў Каўнасе". Неяк дзіўна: у Каўнасе нашы спецыялісты будуць казаць, што наша грамадства стала менш чытаць, а ў Мінску ўсё песцяць думку пра тое, што мы — самая чытаючая нацыя! Пры аптымізацыі школьных і публічных бібліятэк не прападзе ні адзін чытач. Поспех?!"

"Рэпліка пра… Элеанору Язерскую" / № 26

Natalia Tatur:

"Ох, шкада Элеанору! Зіготкая зорка… згарэла…"

Evelina Domnitch:

"Дзякуй, Вера! Майстарскі артыкул! Вы вельмі прыгожа выказалі, як мы, яе блізкія, яе любілі… Яе непаўторнае па энергетыцы выпраменьванне!.."

Фотасюжэт нумара

Тры кірмашы на адным свяце

Фотасюжэт з сёлетняга свята ў Александрыі прапануе вядучы метадыст Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы Алена БЕЛАНОЖКА.

Працяг тэмы **чытайце на старонцы 12.**

З 7 па 20 ліпеня ў Мінску — тэарэтыка-практычны этап XX курса Міжнароднай паслядыпломнай школы **"Нясвіжская акадэмія"**.

"Фізікі" і "лірыкі": "шпагі" ў ножнах?

ТЭКСТ

Жарэс АЛФЁРАЎ,
акадэмік Расійскай акадэміі навук, замежны член Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы

Амаль пяцьдзясят пяць гадоў таму, у верасні 1959-га, у адной з галоўных савецкіх газет быў апублікаваны артыкул Ілы Эрэнбурга, які паклаў пачатак дыскусіі паміж так званымі фізікамі і лірыкамі.

Наогул, канец 1950-х — 1960-я гады тым і адрозніваліся, што бурныя публічныя дыскусіі ўзнікалі ў Савецкім Саюзе бадай з любой нагоды: такі быў час. Час, калі "фізікі", прадстаўнікі навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі, апынуліся сапраўды ў цэнтры ўвагі, у тым ліку — дзеячаў культуры і мастацтва, якія прысвячалі ім карціны, ставілі пра іх спектаклі, здымалі выдатнае кіно, такое, як "Дзевяць дзён аднаго года" або "Іду на навальніцу". Прыгадваюцца радкі з верша Барыса Слуцкага: "Что-то физики в почете. / Что-то лирики в загоне".

Фізіка як навука адыгрывала тады вызначальнае месца ў развіцці краіны. Але і "фізікі" заўсёды з вялікай павагай ставіліся да гуманітарных навук, і ўсе найслынныя фізікі СССР — Капіца, Курчатаў, Аляксандраў, Ландау — былі, у нейкім сэнсе, бліскучымі гуманітарыямі. Сам я не прымаў актыўнага ўдзелу ў спрэчках, хоць яны мяне і цікавілі. Я тады быў кандыдатам фізіка-матэматычных навук, паглыблены ў працу, займаючыся тым, за што ў 2000 годзе атрымаў Нобелеўскую прэмію.

Не думаю, што ўсе гэтыя слоўныя баталіі вяліся сур'ёзна, што называецца, "да крыві". Верагодна, хтосьці крыўдзіўся, хтосьці надаваў занадта вялікае значэнне спрэчкам, але, збольшага, як мне падаецца, ва ўсіх дыскусіях проста адточваўся малады розум, дэманстраваўся малады запал, зухаватасць. Яны давалі імпульс для развіцця і фізікі, і лірыкі.

Сёння я не бачу падставы для аналагічных спрэчак з прыцягненнем да іх вялікіх мас людзей. Не ведаю, да лепшага гэта ці да горшага. Сёння праблема значна больш маштабная. Яна заключаецца ў тым, каб навука — я кажу пра постсавецкую прастору — была б наогул запатрабавана эканомікай і грамадствам! Як бачыцца мне, у Беларусі ў гэтым сэнсе сітуацыя для навуковых работнікаў больш спрыяльная. Хоць бы таму, што наша навука шмат у чым носіць прыкладны характар , калі дасягненні ўкараняюцца, выкарыстоўваюцца наўпрост у эканоміцы. А Расія жыве за кошт нафты і газу, таму і яе навуковы патэнцыял (хтосьці яго лічыць высокім, хтосьці — наадварот, не ў тым справа) не запатрабаваны ў краіне належным чынам. Гуманітарыі ж, на самым першым узроўні — настаўнікі, бібліятэкары, работнікі дамоў культуры і гэтак далей, — папершае, таксама сябе адчуваюць не вельмі добра, калі гаворка ідзе пра аплату іх працы. Па-другое, у некаторых галінах, у расійскай адукацыі, напрыклад, адбыліся жахлівыя змены, якія нічога, акрамя шкоды, людзям не прынеслі. А, дапусцім, у гісторыі мае месца з'яўленне каласальнай колькасці фальшывак, якія трактуюць мінулае аднабакова, заангажавана, неаб'ектыўна. Але... Як я жартую, "Расія — краіна аптыміста, таму што песімісты ўсе з'ехалі". Я — аптыміст. Ні навука, ні культура ў нашых славянскіх дзяржавах не загінулі і не загінуць, пакуль ёсць вялікая руская літаратура, пакуль жывуць творы Коласа, Купалы, Куляшова, Маўра…

> А можа, цяпер няма той адной, скажам так, "новай праблемы", **вакол якой "скрыжавалі б шпагі" цяперашнія "фізікі" і "лірыкі"**. Можа, у 1960-я ўсё было прагаворана, былі расстаўлены ўсе кропкі над "і"…

А можа, цяпер няма той адной, скажам так, "новай праблемы", вакол якой "скрыжавалі б шпагі" цяперашнія "фізікі" і "лірыкі". Можа, у 1960-я ўсё было прагаворана, былі расстаўлены ўсе кропкі над "і": і тэхнары, і гуманітарыі ў ходзе палемік прыйшлі да адзіна слушнай высновы: адно без другога немагчыма. І тыя, і іншыя навукі — калі гэта сапраўды навукі, а не ілжэпошукі, ілжэадкрыцці, ілжэкультура, ілжэмастацтва, — рухаюць прагрэс, аказваюць адно на аднаго ўплыў, дапаўняюць і ўзбагачаюць адно аднаго. І гэта выдатна! А што першасна ў дадзеным кантэксце — "яйка ці курыца" — пакінем гэтае пытанне адкрытым для тых тэарэтыкаў, каму няма чым больш заняцца! А мы, практыкі, будзем прыдумляць новыя тэхналогіі, патрэбныя людзям, і пісаць новыя карціны, якія ўплываюць на іх эстэтычнае развіццё. Сапраўдныя "фізікі" і "лірыкі" паранейшаму ў пашане!..

Глянцавы Макс: вымавіць какетлівае "сэксі"…

ТЭКСТ

Ганна КІСЛІЦЫНА,
літаратурны крытык, супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Постмадэрнізм прынёс на Беларусь не толькі новыя мастацкія формы ды жанры, але і, перш за ўсё, ідэю разумення літаратуры як тавару, што трэба прадаваць, рэкламаваць, прасоўваць на рынку.

Тут жа знайшліся ахвотнікі, якія сталі вымяраць якасць мастацкага тэксту колькасцю прададзеных асобнікаў. Журналісты пачалі складаць рэйтынгі, у каго з аўтараў найбольшыя наклады. Быццам бы і правільна ўсё: а як яшчэ вызначыць якасць, калі не колькасцю? Вось толькі трапляюць у падобныя рэйтынгі пераважна тыя, чыя творчасць можа быць агулам акрэслена як кансьюмерычны рэалізм. Гаворка ідзе пра тэксты, якія адпачатку не разлічаны на адлюстраванне рэчаіснасці з яе сапраўднымі праблемамі, а ствараюцца ў разліку на спажыўца, здатнага выдаткоўваць грошы на культуру толькі ў тым выпадку, калі справа датычыцца забавы і адпачынку.

Але як быць з інтэлектуальнымі прозай, паэзіяй, эсэ? Прызнаць іх няякаснымі з прычыны малой колькасці чытачоў? Колькасць чытачоў-інтэлектуалаў заўсёды была невялікай, але цяпер, у эпоху татальнага спрашчэння чытацкіх густаў, выкліканых безліччу прычын, адукаванага чытача з разуменнем таго, "што такое добра, а што такое дрэнна" знайсці наогул цяжка. Школа, тэлебачанне і другія медыя нават не спрабуюць тлумачыць, як адрозніць якаснае ад няякаснага, сапраўднае ад падробкі. Пра нацыянальную літаратуру тут цяпер гавораць спехам, яшчэ і "дзякуй" чакаюць, што наогул выкладаюць і згадваюць.

> У тэлеперадачы супрацоўнік рэкламнага агенцтва прапанаваў Музею Максіма Багдановіча пераакцэнтаваць увагу на вобраз паэта, "зрабіць яго больш папулярным **для моладзі, культавым, сэксі**"…

Крытэрыі "мастацкага" яшчэ неяк памятаюць філолагі, але дастаткова завітаць на прэзентацыю больш-менш складанай кнігі, каб пераканацца: без масіраванай рэкламы пісьменніку няма чаго чакаць у літаратуры. Не магу не згадаць выпадак, калі на прэзентацыю слыннай кнігі Казіса Сая, якую перакладаў з літоўскай мовы Алесь Разанаў, завітала сем чалавек. З іншага ж боку, вельмі пасрэдная пісьменніца з раніцы збірае залу ўніверсітэта, а вечарам — бібліятэкі. Лагічна, у такім выпадку, думаць, што яна піша, прынамсі, лепш за Разанава! Але насамрэч поспехам яна абавязана жаданню мільгацець паўсюль. Апошняе адкрывае для яе ўсе дзверы — ад тэлестудый да раённых бібліятэк. Але што рабіць чалавеку глыбокаму, не мітуслівому і не публічнаму? Змяняць сваю сутнасць, наймаць літагента? Але ж іх і няма ў нас…

Як чалавек, які хвалюецца за аблічча нацыянальнай літаратуры, моцна перажываю за адсутнасць рэкламы беларускіх і, у першую чаргу, беларускамоўных твораў. З іншага боку, мяне бянтэжаць спробы раскруткі аўтараў праз штучнае наданне ім моднасці. Так, нядаўна паглядзела перадачу пра Музей Максіма Багдановіча, дзе супрацоўнік рэкламнага агенцтва прапанаваў музею пераакцэнтаваць увагу з экспазіцый на стварэнне вобраза самога паэта, "зрабіць яго больш папулярным для моладзі, культавым, сэксі"… Ідэя з захапленнем была падтрымана вядучай, якая радасна стала пытацца ў дырэктаркі ўстановы культуры: "Багдановіч жа сімпатычны? Можа, развіць яго вобраз у гэты бок, у сэксі? Працаваць на масы?" Тагачасная дырэктарка музея Тацяна Шэляговіч баранілася тым, што ў жыцці паэт ніколі не быў прыгажунчыкам. Але каму гэта цікава, калі ёсць нагода вымаўляць какетлівае "сэ-эксі…"

І вось праз нейкі час, быццам бы падвучаныя той перадачай, супрацоўнікі часопіса "Маладосць" ствараюць праект "Зачараваныя Максам" — такі сабе праект па "амадненні" постаці паэта. Шчыра скажу, гэтае панібрацкае "Макс" з вокладкі спачатку настолькі разанула па вачах, што доўгі час нумар нават не брала ў рукі! Разгарнула выпадкова. І высветлілася, што разам з папсовым — у духу танных паўгламурных часопісаў, дзе фальш гучыць у кожным слове — лістом да памерлага Багдановіча, у выданні процьма надзіва цікавых матэрыялаў! Нават навуковыя артыкулы, прысвечаныя невядомым ці малавядомым фактам і дакументам яго жыцця! Такое ўражанне, што стваральнікі праекта для заахвочвання пакупніка вырашылі загарнуць складанае ў простае. Зверху — Макс, а пад вокладкай — Максім. Нават захацелася спытаць у іх: а ці стаў плённым такі ход, ці павялічыліся продажы часопіса? Праўда, пасля згадала, што "Маладосці" ў вольным продажы практычна няма, таму і сэнсу пытанне не мае.

І ўсё ж гэты выпадак прамоцыі аказаўся карысным для мяне самой. Раздумваючы над ім, неяк вельмі ясна зразумела, што ўсё гэтае падфарбоўванне ды агламурванне мае вельмі другаснае значэнне. Бо, насамрэч, для сапраўднага чытача праўда заўсёды будзе больш прывабнай, чым мода.

Мы ў арт-кантэксце. Чаму ж сумняваемся?

ТЭКСТ

Ганна ЧЫСТАСЕРДАВА,
арт-дырэктар Галерэі сучаснага мастацтва "Ў"

Наша галерэя існуе столькі ж, колькі і мастацкі форум "Арт-Вільнюс" у суседзяў-літоўцаў: пяць гадоў. Адпаведна, з акурат такім жа досведам удзелу ў падзеі, казаць пра пэўныя тэндэнцыі як на прадстаўнічай падзеі, так і ў галерэйнай справе наогул можна з дастатковай пэўнасцю.

Сёлета арт-дырэктарам "Арт-Вільнюса" стаў наш добры знаёмец Эрык Шлосэр, вядомы, у тым ліку, і па кірмашы "Арт-Масква". Дык вось, менеджмент форуму вырашыў сканцэнтравацца сёлета на адным напрамку мастацтва, і ім была абрана фатаграфія. Яно і не дзіва: літоўскія майстры фота прызнаныя ў свеце. Мы ж выбралі двух беларускіх фотамастакоў, якія займаюць высокія пазіцыі не толькі на лакальным, але і на еўрапейскім узроўні — Ігара Саўчанку і Андрэя Лянкевіча.

Удзел у арт-кірмашах дазваляе не толькі прэзентаваць краіну, галерэю і канкрэтнага творцу, але і знайсці партнёраў з замежжа, зацікаўленых калекцыянераў. Пра тое, што выбар аўтараў аказаўся "ў яблычак", сведчыць і перамога Ігара Саўчанкі ў намінацыі "Лепшая фатаграфія/Лепшы фатограф". Да ўсяго, вярнуліся і з новай выстаўкай: днямі ў галерэі "Ў" адкрыўся праект Вітаўтаса В. Станёніса "Фотаздымкі для дакументаў", што яшчэ месяц таму дэманстраваўся на "Арт-Вільнюсе".

Удзел у самых розных мастацкіх форумах для галерэі сучаснага мастацтва надзвычай важны. Але кірмаш у Вільнюсе ў гэтым выпадку асабліва блізкі нам праз блізкасць і самога горада (як геаграфічную, так і гістарычную). Урэшце, пра нібыта таннасць удзелу там казаць не буду: фінансавы бок для прадстаўнічых падзей застаецца важкім і ў нечым стрымліваючым фактарам для амбіцыйных задум. Хоць, зразумела, у выпадку з "Арт-Венай" і тым больш "Арт-Базэлем" выдаткі ўдзельнікаў вымяраюцца яшчэ большымі сумамі.

Скептык запытае: выбар лакацыі зразумелы, але ці апраўданы? Ды пяты год прадстаўленыя праекты і галерэі, якія збірае каманда форуму, пераконваюць: "Арт-Вільнюс" зусім не належыць да ліку выключна рэгіянальных кропак сустрэч прафесіяналаў. Брытанскія, нямецкія, французскія, мексіканскія, амерыканскія галерысты імкнуцца сюды.

Не толькі гэты, але і папярэднія гады ўдзелу ў "Арт-Вільнюсе" запэўнілі: беларускае мастацтва, праекты і мастакі менавіта з нашай тэрыторыі, — найвысокага ўзроўню; адпаведна, яны па заслугах ацэньваюцца прафесіяналамі з замежжа. А мы ж, прызнаемся шчыра, нярэдка сумняваемся, наколькі Беларусь уплецена ў той жа еўрапейскі кантэкст, наколькі мы можам выступаць на адным узроўні з прадстаўнікамі блізкіх і далёкіх нам краін.

Глядзець на прэзентаваныя на падобных кірмашах праекты цікава яшчэ і з той прычыны, што ўсе яны прайшлі праз пэўны адбор-"лістынг", атрымаўшы такім чынам і прызнанне не толькі творчага, але і камерцыйнага патэнцыялу. Таму бачныя і агульныя трэнды, і, разам з тым, непадобнасць, а любая адзнака апошняй радуе. Вось сёлета ў нашым павільёне эксперты, гледзячы на здымкі Ігара Саўчанкі, праз пару хвілін маўклівага агляду прамовілі: "Гэта дакладна не літоўскае фота…" Падавалася б, ад Мінска да Вільнюса — усяго 170 кіламетраў, а якасная розніца для профі — відавочная.

Прызнаюся, пакуль я з цяжкасцю ўяўляю, як на Беларусі могуць ажыццявіцца арт-кірмашы кшталту вільнюскага. Прычынай — малая колькасць прафесійных галерэй (не салонаў па продажы жывапісу). Іх, што працуюць па еўрапейскім стандарце, займаюцца праектамі, выстаўкамі, маюць прафесійны куратарскі склад, не становіцца больш па ўсёй краіне. Няма творцаў і ініцыятараў зрухаў? Але на тым самым "Арт-Вільнюсе" розніцы паміж прадстаўнікамі мегаполісаў і правінцыйных мястэчак не заўважалася. Справа — у постаці мастака, з якім працуе галерэя, у яго ідэях, майстэрстве, што не мае геаграфічнай прывязкі. Так, розніца ў фінансавай забяспечанасці і магчымасцях, безумоўна, існуе. Але пра грашовыя цяжкасці скажуць вам і ў Лондане, і ў Празе, і ў аддаленым мястэчку, ці не так?..

У варшаўскім Музеі Незалежнасці экспануецца мабільная фотавыстаўка **"Беларусь у час Першай сусветнай вайны"**.

Чатыры дні на іншай планеце…

Хачу сказаць некалькі слоў з нагоды VIII Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня", на якім мне ўдалося сёлета пабываць.

ТЭКСТ

Настасся КОМЛІК-ЯМАЦІНА,
вядучы метадыст па фальклоры Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці

Як вядома, праект фестывалю быў распрацаваны даволі даўно, і першая "Берагіня" аб'яднала аматараў беларускага фальклору яшчэ ў 1999 годзе. Кожны раз канцэпцыя мерапрыемства ўдасканальвалася, і, на маю думку, цяпер фэст дэманструе нам амаль ідэальную мадэль традыцыйнай культуры, асноўны прынцып якой — сінкрэтызм. Як у традыцыйнай культуры розныя віды і жанры мастацтва адлюстоўваюць глыбінны сэнс духоўных каштоўнасцей народа і цесна звязаны паміж сабой, так і "Берагіня" ўяўляе з сябе цэласную ды звязную сістэму выхавання праз традыцыйную культуру.

Спачатку мяне як кіраўніка творчай дэлегацыі ад Міншчыны такі сінкрэтычны падыход нават абурыў: дзіцячаму калектыву трэба было падрыхтаваць праграму, якая ўключала сольныя і ансамблевыя спевы, інструментальную музыку, выступленні танцавальных пар, карагод, выстаўку дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з самапрэзентацыяй, дэкламацыю народнай прозы (казкі, хуткамоўкі), дэфіле традыцыйных строяў свайго рэгіёна з тлумачэннямі, замалёўкі на Купалле… І ўсё гэта мусіць быць пабудавана на мясцовым матэрыяле. А значыць, першым этапам падрыхтоўкі павінны стаць экспедыцыі па зборы ды апрацоўцы матэрыялу. Пагадзіцеся, задача вельмі складаная. Асаблівыя цяжкасці выклікала недастатковае фінансаванне (касцюмы і абутак удзельнікаў павінны быць адпаведнымі) і нізкая цікавасць з боку дзяцей: каб падрыхтаваць праграму, якая адпавядала б усім умовам фестывалю, неабходна поўнае пагружэнне маленькіх артыстаў у культурную спадчыну свайго краю.

Але, трапіўшы на сам фестываль, я зразумела, што толькі такі сістэмны ды комплексны падыход і забяспечвае тую самую непаўторнасць ды "іншапланетнасць", што выгадна адрозніваe фестываль ад іншых мерапрыемстваў такога кшталту.

Значнай асаблівасцю сістэмы "Берагіні" з'яўляецца трывалы навуковы падмурак: на фестывалі плённа працаваў экспертны савет, у склад якога ўваходзілі прызнаныя спецыялісты: кандыдаты культуралогіі і мастацтвазнаўства, доктар філалагічных навук, прафесар, мастак... А яшчэ першы раз на фестывалі я бачыла такую грунтоўную філасофска-метадалагічную базу. Да таго ж, "Берагіня" адначасова з'яўлялася і творчай лабараторыяй, дзе кожны ўдзельнік мог атрымаць змястоўныя адказы ад любога прадстаўніка экспертнага савета, члены якога ўвесь час былі, што называецца, "навідавоку" і нікому не адмаўлялі ў дапамозе.

> Выказвалася меркаванне, што прыцягненне большай колькасці гасцей і, тым больш, замежных турыстаў прывядзе **да змены фармату фестывалю**: маўляў, з традыцыйнага мастацтва ён скаціцца да "папсовага". Я з тым не згодная. Прыцягненне большай увагі не азначае змену канцэпцыі.

Аднак я была здзіўлена і нават шакавана адсутнасцю папярэдняй інфармацыі аб фестывалі: пра яго ведалі толькі арганізатары, удзельнікі, некаторыя прадстаўнікі прэсы ды жыхары Рудабельшчыны. Гэта ж фэст з велізарным размахам крылаў, арганізаваны на высокім мастацкім ды прафесійным узроўні, не горшы за еўрапейскія, якім можна смела ганарыцца!.. Але "Берагіня" прайшла ціха і незаўважна для большасці насельніцтва Беларусі, не кажучы ўжо пра блізкае і тым больш далёкае замежжа. На "круглым стале", зладжаным для абмеркавання вынікаў фестывалю і распрацоўкі канцэпцыі наступнай "Берагіні", было ўзнята пытанне анансавання фэсту па Беларусі і за яе межамі. Думкі ўдзельнікаў падзяліліся. Выказвалася меркаванне, што прыцягненне большай колькасці гасцей і, тым больш, замежных турыстаў прывядзе да змены фармату фестывалю: маўляў, з традыцыйнага мастацтва ён скаціцца да "папсовага" (менавіта такі тэрмін выкарыстаў запрошаны прафесар Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аляксей Шылін).

Я з тым не згодная. Прыцягненне большай увагі не азначае змену канцэпцыі. Класічная музыка не перастае быць класічнай, хаця на канцэрты збіраюцца сотні і тысячы людзей. Так і "Берагіні" зусім не абавязкова змяняць сваю сутнасць. Запрашэнне большай колькасці гасцей дазволіць папулярызаваць нашу культурную спадчыну, тым самым падтрымліваючы яе. Калектывы, якія рыхтаваліся да фестывалю, правялі велізарную і карысную працу: сабралі ўнікальны матэрыял па сваёй мясцовасці, сістэматызавалі яго, апрацавалі, падрыхтавалі прэзентацыю. Але вынік гэтай працы пабачыла вузкае кола людзей: група спецыялістаў і некалькі калектываў з іншых абласцей. На мой погляд, мы не павінны замыкацца, хаваць нашыя дасягненні, вырашаць агульныя праблемы вялікага маштабу маленькім колам энтузіястаў…

На Беларусі здаўна было прынята рабіць вялікую працу, вырашаць цяжкія для аднаго чалавека задачы талакой. Захаванне фальклорнай спадчыны нашай краіны — актуальная праблема сённяшняга часу. Сучаснасць вымушае прыцягваць да культуры (асабліва традыцыйнай) не толькі навуковыя ды мастацкія ўліванні, але і фінансавыя. Вось і аматарам беларускага фальклору варта крочыць у нагу з часам ды жыццёвымі патрабаваннямі, захоўваючы свой глыбінны сэнс і духоўныя каштоўнасці.

Чаму, напрыклад, Беларусь у Еўропе прэзентуе фестываль эстраднага мастацтва "Славянскі базар у Віцебску"? Чаму б не стаць такім маркерам і ўнікальнай з'яве аўтэнтычнай культуры — "Берагіні"? Я думаю, многія нашы блізкія і далёкія суседзі дорага заплацілі б, каб пабачыць, дакрануцца душой да непаўторнай беларускай культуры, каб мець магчымасць паўдзельнічаць у гэтым цудзе — у Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва "Берагіня"...

А дзе эфект ад таго, што ёсць?

…Паэт чытаў горача, экзальтавана. Перад помнікам Янкі Купалы. "Няма мовы, няма беларусаў, няма краіны!.." І нібыта высакародным быў яго гнеў і шчымлівым — яго боль, але нешта не давала душы адгукнуцца ў адказ…

ТЭКСТ

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ,
паэт, дырэктар Дырэкцыі замежнага вяшчання Беларускага радыё

А я? — думалася з трывогай. — А мае дзеці, а тыя, хто стаіць побач, а сотні маладых людзей, якія наладжваюць курсы мовы, а дзясяткі герояў маіх тэлеперадач? Нас што, таксама няма? Канешне ж, можна зразумець паэтычную гіпербалу, высакародны парыў, але хацелася спытаць, а ці верыць ён ва ўласнае існаванне і што зрабіў, каб яго радкі не гучалі так апакалепсічна.

…Сын выдатнага беларускага творцы, апраўдваючыся перад сваім выступленнем, дзе ён чытаў уласныя вершы не па-беларуску, тлумачыў так: "Я нарадзіўся ў Мінску, і ні дома, ні на вуліцы не чуў беларускай мовы…" Зачапіла не тое, што вершы не па-беларуску, былі б добрыя, а што дома ў беларускага творцы ён не чуў роднай мовы…

Сябра — сын майго былога калегі, выдатнага журналіста і маці, настаўніцы беларускай мовы і літаратуры, — прызнаецца ў друку, што не валодае мовай і таму не піша на ёй, бо трэба адчуваць смак слова роднага, а ён па тых жа прычынах быў з дзяцінства гэтага пазбаўлены.

Мой сын Максім, убачыўшы ў дзённіках аднаго з класікаў цэлыя абзацы, занатаваныя не такой мовай, якой былі напісаны ўлюбёныя ім творы, доўга хадзіў прыгаломшаны, хаця і меў ужо досвед, калі ў доме творчасці "Іслач", куды я яго прывозіў малога, з пакоя, дзе жыла сям'я палымянага паэта, несліся словы, што надта ўжо дысанавалі з вершаванымі заклікамі трыбуна…

Абыякавасць мае багатую гісторыю і даўнюю традыцыю. Таму, калі ў мяне пытаюцца, на якой мове я размаўляю дома, з сябрамі, я не крыўдую. Разумею, людзям хочацца дакапацца да праўды, апраўдаць тое, што іх трывожыць, бо ведаю людзей, якія шкадуюць, што адарваліся ад роднага слова, імкнучыся стаць "гарадскімі", "сучаснымі"...

> Няма сцэнарыяў? Дык у нас толькі афіцыйна прызнаных літаратараў пад тысячу. А Універсітэт культуры? А беларускія філфакі практычна ў кожным абласным цэнтры? А выдавецтвы? Дзяржава ўкладвае грошы, і немалыя. Трэба больш? Але **дзе аддача** ад таго, што ёсць?

Гэта тыя, хто ўсё ж адарваўся. А як далучыць да вытокаў тых, хто нарадзіўся ў гэтых беларускіх сем'ях, хто ні дома, ні ў садку, ні ў школе не чуў напоўніцу багацця нашай мовы? Можна, канешне, закідваць папрок на адрас дзяржаўных устаноў, неразваротлівых чыноўнікаў, але давайце прыгадаем: а колькі кожны з нас прыклаў намаганняў, каб выправіць сітуацыю не лозунгамі ды пратэстамі, а прынцыповай уласнай патрыятычнай пазіцыяй?

Чаму настаўнік беларускай мовы, прыходзячы ў клас, нібыта саромеецца гэтай мовы, пераходзячы ў час перапынкаў і класных гадзін на іншую? Я ўжо не раз згадваў, што ў маёй рускамоўнай школе мая настаўніца беларускай мовы гаварыла з намі заўсёды толькі па-беларуску, што ў нас праводзіліся ранішнікі ды іншыя пазашкольныя мерапрыемствы таксама на роднай мове.

Можна шмат папрокаў выказаць і на адрас работнікаў культуры. Паглядзіце на рэпертуар калектываў самадзейнасці, на арганізацыю вечарын, святаў. Сорамна сказаць, але вяселле ўласнага сына, дакладней, урачыстасць у Доме шлюбаў аднаго з самых, здавалася б, беларускамоўных раённых гарадкоў, прайшла па зусім іншых лякалах, а потым мне работніцы ўстановы апраўдваліся, што хацелі па-беларуску, але баяліся нарабіць памылак…

Няма сцэнарыяў? Дык у нас толькі афіцыйна прызнаных літаратараў пад тысячу. А Універсітэт культуры? А беларускія філфакі практычна ў кожным абласным цэнтры? А выдавецтвы, а часопісы? Дзяржава ўкладвае грошы, і немалыя. Трэба больш? Але дзе аддача ад таго, што ёсць?

Казаць гарачыя прамовы, безумоўна, прасцей, чым займацца штодзённай чорнай, не заўсёды ўдзячнай працай. Але калі не пачынаць з сябе, жаданы эфект толькі будзе аддаляцца…

Якога гледача хоча тэатр?

У працэсе абмеркавання спектакля "По имени Господин", паказанага днямі ў рамках II Лабараторыі рэжысёрскіх праектаў Цэнтра эксперыментальнай рэжысуры, у мяне склалася ўражанне, што нашы глядач і тэатр не вельмі добра знаёмыя. У акцёраў-рэжысёраў-крытыкаў свае ўяўленні пра гледача, у гледача — свае пра тэатр. Прычым і першыя, і другі недаацэньваюць адно аднаго.

ТЭКСТ

Дар'я КУЛЬША,
тэатральны глядач

І ім трэба часцей сустракацца па-за фарматам "сцэна — глядзельная зала", больш мець зносін, размаўляць, знаёміцца бліжэй, даведвацца пра інтарэсы, жаданні, патрэбы кожнага з бакоў, дзяліцца сваімі ўражаннямі і назіраннямі, аналізаваць і рабіць высновы, каб і тэатр, і глядач маглі рушыць наперад і насустрач адзін аднаму.

Глядач — розны. Ёсць тыя, хто можа ўспрымаць толькі "класіку": тэатр у касцюмах і парыках, з дэманстратыўна тэатралізаванай прамовай і фіналам з кропкамі над "і" ды над "ё". Ёсць глядач, які ходзіць у тэатр, таму што "трэба", дзеля "птушачкі" ("Культурныя людзі ходзяць у тэатр"; білеты распаўсюджваў прафсаюз \ БРСМ \ ...); звычайна такі глядач успрымае ўсё на ўзроўні "падабаецца — не падабаецца" (калі наогул успрымае), і добра, калі ён праз тыдзень успомніць, пра што быў спектакль і што наогул адбывалася… А ёсць глядач, згаладалы па свежым у тэатры, які прагне складаных, глыбокіх пастановак, гатовы да новых форм ды смелых праяў. І так будзе заўжды. Заўжды зноўдуцца і першыя, і другія, і трэція. Глядач будзе розны. І тэатр будзе розны. Павінен быць, прынамсі.

І можа, усё ж варта глядзець крыху наперад і думаць пра таго гледача, якога тэатр хоча бачыць? А не арыентавацца толькі на сённяшняга сярэднестатыстычнага: маўляў, да чаго ён прывык, да чаго гатовы, што можа "пераварыць". Гледача можна выхоўваць, гадаваць, прывучаць да новага. Інакш не будзе прагрэсу. А заўсёды ж варта аказвацца хоць на паўкрока наперадзе, выходзіць з зоны камфорту... Каб глядач развіваўся і больш з'яўлялася думаючых, гатовых успрымаць няпростае і небанальнае на сцэне, тэатру трэба даваць людзям у зале нагоду і спажыву. Спрабаваць быць смелым, эксперыментаваць. Не баяцца прапаноўваць новыя формы, узнімаць новыя тэмы... Менавіта тэатр павінен стаць ініцыятарам гэтых змен, ён мусіць расці крыху хутчэй за гледача. А апошні падцягнецца... Калі б у свой час карыфеі рускага тэатра не адвучылі гледача есці ды размаўляць пад час прадстаўлення, то так было б і да гэтага часу...

І ў нас, без сумневаў, ёсць глядач, гатовы ўспрымаць і па вартасці ацэньваць інтэлектуальны тэатр. Гэта я да заўвагі Вадзіма Салеева пад час абмеркавання, што выбіраючы матэрыял ды беручыся за яго пастаноўку, трэба арыентавацца на сённяшняга беларускага гледача, разумець яго ўзровень і тое, што ён можа ці не можа ўспрыняць; і што прапаноўваць складаны інтэлектуальны тэатр — небяспечна: наш глядач не гатовы да такога матэрыялу. Мы жывём у эпоху, калі людзі ўсё менш адчуваюць і ўсё больш думаюць, калі на тое, што адбываецца з імі ў жыцці (і ў тэатры як частцы жыцця), схільныя больш "уключацца" галавой, чым сэрцам. Інтэлектуальны тэатр у гэтым сэнсе вельмі запатрабаваны. Ён мае вялікую патэнцыйную аўдыторыю. Прычым гэта часцей за ўсё не заўзятыя тэатралы, а, хутчэй, людзі, якія нават не глядзяць у бок тэатра. І прапаноўваючы такі кірунак, можна пашыраць гарызонты ды прыцягваць у тэатр новых людзей.

А я асабіста ўсё ж за тэатр, які выклікае эмоцыі, пачуцці, перажыванні, тэатр, нацэлены на душу і сэрца гледача, каб хаця б такім шляхам ўскалыхнуць тое, што многія баяцца прымаць у сабе, ці не ўмеюць, ці развучыліся...

Шостым па ліку балетам у афішы Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра стане "Дон Кіхот" Л.Мінкуса.

Артур Міхайлаў.

Міхайлаў, якому не патрэбен псеўданім

Для конкурсу — Элвіс, "Чырвоная ружа" і "Вуціца"

Напярэдадні XXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" мы, паводле традыцыі, знаёмім чытачоў са спеваком, за якога будзем "хварэць" у час нашага "Славянабачання". Беларусь на XXIII Міжнародным конкурсе маладых выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск" прадставіць Артур МІХАЙЛАЎ — саліст цыганскага шоу "Алюр" Маладзёжнага тэатра эстрады, лаўрэат нядаўняга Нацыянальнага конкурсу ў Маладзечне ды іншых прэстыжных спаборніцтваў. У паўфінале ён праспявае знакамітую "Чырвоную ружу" Уладзіміра Мулявіна, а для фіналу, які пройдзе, як заўсёды, у два дні, падрыхтаваў беларускую народную песню "Вуціца" і кампазіцыю з рэпертуару Элвіса Прэслі.

Надзея БУНЦЭВІЧ

— Усе гэтыя песні, пэўна, будуць у апрацоўцы-аранжыроўцы Пятра Ялфімава? Вы ў яго вучыліся, але падтрымліваеце добрыя стасункі і зараз...

— Насамрэч, пасля заканчэння навучання мы амаль год не бачыліся. А цяпер, пры падрыхтоўцы да конкурсу, заняткі ўзнавіліся, за што я яму вельмі ўдзячны. Яшчэ на першым курсе ён мяне заўважыў, узяў у свой клас, і цягам пяці гадоў навучыў многім прафесійным вакальным "фішкам". Дарагога каштуе і тое, што Пётр калісьці сам быў удзельнікам конкурсу "Славянскага базару...", атрымаў "абсалютны", я нават сказаў бы — "эталонны", Гран-пры. Магчымасць выкарыстоўваць яго аранжыроўкі і карыстацца ягонымі парадамі — сапраўдны падарунак лёсу!..

— А што дала праца ў "Алюры"?

— Найперш — вялікі сцэнічны досвед, які стаў для мяне новай прыступкай у творчасці. Я прыйшоў у ансамбль паўтара года таму, калі заканчваў навучанне. Калі на заняткох асноўная ўвага скіроўвалася на вакал, дык тут мяне навучылі вольна трымацца на сцэне, адчуваць сцэнічную прастору, энергетыку залы, бо трэба было не толькі спяваць, але і рухацца, танцаваць, размаўляць — быць у поўным сэнсе слова артыстам. Я літаральна "паміраў" у харэаграфічным класе, але гэта дало свае вынікі. Тое, чым я сёння валодаю, — заслуга ўсіх маіх выкладчыкаў, пачынаючы з Дзмітрыя Сушко, які кіраваў эстраднай студыяй "Жывы гук" у Маладзечанскім палацы культуры. Зараз ён там не працуе, у яго свая творчая лабараторыя ў Мінску. А пазнаёміліся мы з ім, калі мне было сем гадоў. На той час я ўжо вучыўся ў музычнай школе, але мама прывяла мяне яшчэ і да Дзмітрыя Іосіфавіча. Тады тая студыя знаходзілася побач з 10-й школай, гэта была зусім маленькая каморка, але справа не ў сценах, а ў тым, што займаючыся ў студыі, я пачаў выходзіць на сцэну, удзельнічаць у сваіх першых конкурсах…

> Артур Міхайлаў: "Мне ўвогуле цікавая сучасная музычная культура, **манера эстраднага выканання розных краін**. У кожнага народа — свой характар".

— І што, так у дзяцінстве і вырашылі стаць музыкантам ?..

— Са спортам я і зараз сябрую, рэгулярна хаджу ў трэнажорную залу. Дый адпачынак люблю актыўны... А ў дзяцінстве любіў глядзець на цягнікі. На чыгунку мяне прыводзіў дзядуля, распавядаў пра майго прадзеда, якога я не ведаў. Я пра гэта потым вершы напісаў — у рытміцы "Тараса на Парнасе": "Прадзед мой машыністам быў, / Не ведаў лепшага стасунку. / З юнацтва да старых гадоў / Яго жыццём была чыгунка. / І я, як трошачкі падрос, / Душой да цягнікоў прырос".

— Мяркую, гэта далёка не адзіныя радкі, вамі напісаныя? Можа, ёсць і песні?

— Будуць. Пакуль я проста занатоўваю вершы ў сшытак, не паспяваю нават іх як след адрэдагаваць. Але мелодыі да некаторых з іх у галаве "круцяцца".

— Разам з аранжыроўкамі-"мінусоўкамі" ці з аркестрам?

— Аранжыроўкай я ніколі не займаўся. На гэта ёсць добрыя спецыялісты, у тым ліку сярод маіх сяброў. А спяваць з аркестрам — ні з чым не параўнальная асалода! Аркестр — гэта жывая душа, якую трэба разумець, і тады яна зразумее цябе…

— Упершыню з аркестрам, здаецца, вы заспявалі на конкурсе ў Маладзечне? Не на сёлетнім, а два гады таму…

— Так. Мне вельмі пашанцавала, што гэта быў калектыў народнага артыста Беларусі, прафесара Міхаіла Фінберга. Ён вельмі патрабавальны дырыжор і музыкант, і я ўдзячны яму за ўсе заўвагі ды падказкі, асабліва на цяперашнім этапе. Дый са многімі аркестрантамі ўжо паспеў пасябраваць. Асобная падзяка — стылісту Валянціне Цімафеевай з Нацыянальнай школы прыгажосці, з якой мы "складаем" мой знешні вобраз.

— Такая мэтанакіраванасць на "Славянскі базар..." з'явілася толькі цяпер? Спачатку вы не падавалі заяўку на ўдзел — ваша кандыдатура ўзнікла тады, калі быў аб'яўлены другі тур адбору з прыцягненнем дадатковых удзельнікаў. Толькі не кажыце: маўляў, я і не думаў, а тут мяне, як у кіно, заўважылі "на вуліцы", запрасілі...

— Ды я штогод сачу за фестывалем і конкурсам у Віцебску! Але сёлета вырашыў удзельнічаць у Нацыянальным конкурсе ў Маладзечне, усю ўвагу скіраваў туды. Калі ж мне параілі далучыцца да другога адборачнага тура на Віцебск, адмовіцца я не мог, бо заўсёды марыў пра гэтую сцэну. "Славянскі базар ..." — гэта новая прыступка ў маім жыцці.

— Калі вы так марыце пра сольную кар'еру, дык ці не думалі пра псеўданім? Справа ж не толькі ў Стасе Міхайлаве. У Запарожжы, калі меркаваць па запісах, выкладзеных у Інтэрнэце, ёсць ваш поўны цёзка — спявак Артур Міхайлаў…

— Хай бяруць псеўданім іншыя, калі ім такое "суседства" нязручнае. І хай параўноўваюць мяне, калі хочуць, з тым жа Стасам Міхайлавым. Улічваючы ўзровень яго папулярнасці, гэта не так ужо і блага. Я ж, у сваю чаргу, паспрабую зрабіць усё, каб унесці ў нашу эстраду сваю "нотку", каб мяне немагчыма было ні з кім параўноўваць і, тым больш, блытаць. А ад прозвішча свайго бацькі адмаўляцца не збіраюся. Для мяне гонар насіць гэтае імя!..

— Тады можна больш падрабязна пра сям'ю? Вашы бацькі часам не музыканты?

— Не, але ўсе цікавяцца музыкай ды іншымі мастацтвамі. Бацька заканчваў політэхнічны інстытут, ён у мяне — майстар на ўсе рукі, асабліва ў аўтамабільнай справе. Маці ў свой час скончыла музычную школу, працавала ў Палацы культуры чыгуначнікаў у Маладзечне, праводзіла конкурсы, вяла канцэрты, спявала сама — была звязана з артыстамі. Сёння для яе галоўным артыстам стаў я. Як і бацька, яна ва ўсім мне дапамагае, хвалюецца за мяне часам больш, чым я сам…

— А каханая?

— У мяне няма знешняга ідэалу, як яна павінна выглядаць. Галоўнае, каб была добрай, вернай, пачуццёвай, бачыла ўва мне тонкую душэўную асобу, разумела, што з артыстам бывае складана, але цікава. Я ўмею кахаць — і спадзяюся на ўзаемнасць.

— Значыць, у Віцебск з вамі паедуць сябры?

— Так. Але ў мяне будзе і моцная сямейная падтрымка. Гэта не толькі бацькі, але і шматлікія сваякі, уключаючы двухгадовага стрыечнага брата Ваню, які быў у мяне за кулісамі ў Маладзечне (ён, між іншым, туды сам папрасіўся). Так што яго таксама рыхтуюць да конкурсу — каб уседзеў увесь канцэрт, бо невядома, які нумар я выцягну. Кожныя выхадныя мы ўсёй сям'ёй збіраемся ў Маладзечне ў маёй бабулі, якой споўнілася 65. Яна добра гатуе грэчаскія стравы, яе кулінарныя шэдэўры неаднойчы адзначаліся на Фестывалі нацыянальных культур у Гродне. Усё вельмі проста. Мой прадзед быў грэкам. У час вайны лёс закінуў яго сюды, і ён застаўся ў Беларусі. Тут нарадзілася ў яго дачка — мая бабуля, маці майго бацькі. Ведаючы маю любоў да ўпрыгожванняў, неяк яна падарыла мне завушніцы — на ўдачу. І тыя сталі для мяне чымсьці накшталт "фамільнай каштоўнасці": я іх ніколі не здымаю, яны — як сувязь з усёй маёй сям'ёй, маімі продкамі. Грэцыя шмат значыць у маім жыцці. З дзяцінства я жыў у асяроддзі грэкаў, слухаў грэчаскую музыку, размаўляў на грэчаскай мове. У мяне шмат кніг пра гэтую краіну, яе багатую гісторыю і культуру, я заўсёды сачу за тамтэйшымі падзеямі.

— У Грэцыі часта бываеце?

— Будзеце смяяцца, але я ніколі там не быў. Можна сказаць, шавец без ботаў. Але вельмі хачу там пабываць, і, думаю, мая мара хутка ажыццявіцца — можа, нават гэтым летам, пасля "Славянскага базару ў Віцебску"…

— Што яшчэ плануеце на "пасля фестывалю"?

— Хачу асвоіць ігру на гітары. Калісьці ў дзіцячай музычнай школе я навучаўся граць на фартэпіяна, гэтыя заняткі прадоўжыліся і ў інстытуце, але ніякім іншым інструментам я так больш і не авалодаў. Трэба, нарэшце, ліквідаваць гэты прагал! Ну, і, вядома, буду працягваць пашыраць рэпертуар. У тым ліку — на розных мовах.

— Руская, беларуская — зразумела. Англійская — таксама, бо дрэнны той спявак, да каго не прыходзіць прывід "Еўрабачання". Няцяжка зразумець, навошта вам, можа, у хуткім часе спатрэбіцца цыганская. Нічога дзіўнага няма і ў тым, што вы сталі першым выканаўцам грэчаскіх песень у Беларусі. А іншыя мовы?

— Мне ўвогуле цікавая сучасная музычная культура, манера эстраднага выканання розных краін. У кожнага народа — свой характар. Іспанцы — палкія, тэмпераментныя, і мова ў іх такая ж. У французаў — больш стрыманая, але вельмі рамантычная, пяшчотная лірыка. І такая ж мова! Французскую я вывучаў, дарэчы, у школе. Ведаючы мае музычныя захапленні, настаўніца часта прыносіла мне касеты з запісамі французскай эстрады. Першая з іх была — Джо Дасэна. Спрабую я спяваць і на сербскай мове — эксперыментую. "Здымаю" тэкст, пераводжу, каб разумець дакладны сэнс кожнай фразы і слова. Завучваю, знаходжу вобраз, спяваю. Спецыяльных выкладчыкаў, коўчараў, якія біліся б са мной над вымаўленнем, у мяне няма. Усё раблю сам. Але ж якую асалоду ад усяго гэтага атрымліваю! Цікава шукаць штосьці новае — гэта першы (і, мабыць, адзіны) шлях да ўдасканалення…

К

ф о т а ф а к т

Зала ў брамніка

У Століне выстаўкай жывапісу заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Уродніча (дарэчы, ураджэнца раёна) адкрылася выставачная зала ў адрэстаўраваным будынку колішняга Доміка брамніка маёнтка Радзівілаў на ўваходзе ў парк "Манькавічы". На вернісаж "Дарогай памяці", прысвечаны 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прыехаў і сам творца.

У экспазіцыі — больш як 20 палотнаў. Уладзімір Уродніч парадаваўся, што ў Століне з'явіўся такі агмень мастацтва. А адну са сваіх карцін — "Светлы дзень" — аўтар падарыў краязнаўчаму музею. Мяркуецца, што зала стане прытулкам для выставак, майстар-класаў, прэзентацый і творчых сустрэч. Тут стартуюць падзеі з нагоды 130-годдзя заснавання парку "Манькавічы", юбілей якога адзначым налета.

Галіна ГАШЧУК / Столін / Фота аўтара

У Горкаўскім тэатры 19 верасня прэм'ера **камедыі дэль артэ** "Viva Commedia!", пастаўленага італьянцам Матэа Сп'яцы.

Ці сапраўды святы ў райцэнтрах **"нахабна сядзяць на бюджэце"?**

Сёння мы вырашылі пагаварыць пра фестывальную "кухню". Дакладней — пра тое, якіх высілкаў, маральных і эканамічных, патрабуе не толькі стварэнне фэсту, але і лагічнае развіццё апошняга. Жыццё пераконвае, што гэты рух — непазбежны. Ужо цяпер можна смела згадаць з дзясятак праектаў, якія нарадзіліся ў раённых цэнтрах ды за пэўны час паспелі займець брэндавы статус. І гэтымі фэстамі пачалі цікавіцца турысты, майстры традыцыйнай творчасці, аматары нацыянальнага мастацтва. Скасаваць такі рух — значыць загарнуць адну з яркіх старонак самабытнай беларускай культуры. Усё большая яе запатрабаванасць нараджае новыя фэсты. Працэс іх станаўлення залежыць ад самых розных фактараў. Маю на ўвазе арыгінальнасць ідэі і важкасць мэты, прывабнасць для фундатара-мецэната, яркасць і даходлівасць рэжысуры, зручнасць побытавых і транспартных умоў... Ды ці мала яшчэ ў маштабнага ды перспектыўнага фестывалю складнікаў? Акурат столькі, колькі і праблем. Вось пра гэта мы і пагаворым. Натуральна, што слова вырашылі даць прафесіяналам — дырэктарам фестываляў (яны ж у нашым выпадку — начальнікі аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкамаў), якія даказалі сваю патрэбнасць. А раптам тэхналогія "фестываляўтварэння" падкажа, у якім кірунку трэба рухацца іншым аддзелам, што яшчэ не займелі пераканаўчых і шырока вядомых святаў?..

Яўген РАГІН

Пад назвай "Фестываль"

Бюракратыі б паменш!

Васіль КАТКАВЕЦ, дырэктар Адкрытага Абласнога фестывалю дзіцячай тэатральнай творчасці "Чароўны куфэрак" (Любань):

— У наступным годзе будзем праводзіць юбілейны — дзясяты — фэст. Такім чынам, яму ўжо дваццаць гадоў. Пачыналі з маленькай райцэнтраўскай акцыі — сёння ж у мерапрыемстве ўдзельнічаюць украінскія, польскія, расійскія калектывы…

А пачынаецца ўсё з рэкламнай кампаніі: у СМІ, на сайтах, форумах ды ў сацыяльных сетках. Потым адглядаем відэаматэрыялы тых спектакляў, якія прэтэндуюць на ўдзел у "Чароўным куфэрку". Так складаецца праграма чарговага мерапрыемства. Дарэчы, кожны раз яна скіравана на прапаганду творчасці таго або іншага беларускага пісьменніка. Ідэя — нязменная: ушанаванне роднай драматургіі. На гэта працуюць драматычныя, лялечныя спектаклі. А цягам апошніх гадоў мы даём магчымасць для прэзентацыі тэатральных эксперыментаў: пластычных пастановак, мюзіклаў. Запрашаем да ўдзелу беларускіх драматургаў… Карацей, развіваемся.

Раней крыніцай фінансавання былі толькі абласныя і раённыя грошы. Цяпер выкарыстоўваем і спонсарскую дапамогу, а таксама — уласны пазабюджэт. Спонсары: мясцовыя прадпрымальнікі, кіраўніцтва камбіната будаўнічых матэрыялаў, ільнозавода...

Кошт мінулага фестывалю — каля 80 мільёнаў рублёў. Дзесяцьдванаццаць працэнтаў ад гэтай сумы — пазабюджэт і спонсарскія грошы. Падтрымлівае нас і абкам прафсаюза работнікаў культуры. Астатнія сродкі — абласныя… Так, існуе меркаванне, што фестывалі, якія ладзяцца ў правінцыйных гарадах, "нахабна сядзяць на бюджэце". Скажу ў адказ вось што. Раённы бюджэт, згодна з Палажэннем фінансавання абласных фестываляў, можна выкарыстаць толькі для наладжвання, скажам, святла ды гуку на тэатральных пляцоўках. Дарэчы, а спонсарская дапамога ідзе толькі на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы. Нельга прасіць, скажам, у прадпрымальніка грошы на харчаванне ды пражыванне гасцей фэсту, бо фінансісты кажуць, што гэта — не мэтавае выкарыстанне спонсарскай дапамогі, не ўмацаванне тэхнічнай базы. Але выкручваемся. Лясгас, да прыкладу, бярэ на сябе выдаткі на пражыванне артыстаў у Паляўнічым дамку…

Ці трэба пераконваць, што быць арганізатарам фэсту — справа не з лёгкіх? Тым больш сёння. І не толькі эканамічны крызіс маю на ўвазе. Шмат бюракратычных перашкод на стыку розных ведамстваў ды арганізацый, якія займелі статус дзяржаўных устаноў. Я запрашаю, да прыкладу, калектыў з пэўнай гімназіі. Гэта — сфера адукацыі, таму трэба паблукаць ці не па пяці інстанцыях — ад абласных, раённых да гарадскіх. Як прыехаць, як аплаціць камандзіровачныя выдаткі?

Васіль Каткавец: "Існуе меркаванне, што фестывалі, якія ладзяцца ў правінцыйных гарадах, **"нахабна сядзяць на бюджэце"**. Раённы бюджэт можна выкарыстаць толькі для наладжвання, скажам, святла ды гуку на пляцоўках. Нельга прасіць, скажам, у прадпрымальніка грошы на харчаванне ды пражыванне гасцей, бо фінансісты кажуць, што гэта — не мэтавае выкарыстанне спонсарскай дапамогі".

Раней пры агульных каштарысах такіх пытанняў ды праблем увогуле не існавала. Цяпер для ўзгаднення таго, што харчаванне і праезд школьнага калектыву бярэ на сябе навучальная ўстанова, недаравальна марнуецца час і нервы. Варта, на мой погляд, наладзіць тут сістэму цэнтралізаванага фінансавання…

Напярэдадні фэсту мы ладзім онлайн-канферэнцыю, пад час якой тлумачым кожнай дэлегацыі, калі і як прыязджаць, дзе жыць і харчавацца.

Ці задаволены я фестывальным вынікам? Задаволены! Праблем з гледачом няма. Ёсць пытанне з дадатковымі сцэнамі. Спектаклі для моладзі заўжды носяць праблемны характар. Пэўную колькасць білетаў мы безахвярна перадаём для тых падлеткаў, што знаходзяцца на ўліку ў камісіі па справах непаўналетніх. Ёсць спектаклі для дарослых. Фестывальнымі днямі Любань жыве ў атмасферы тэатральнага свята і абсалютна не пачувае сябе правінцыяй. Але беларускае тэлебачанне нашы спектаклі чамусьці пастаянна ігнаруе…

У мяне ў аддзеле працуюць пяць чалавек, якія прайшлі праз школу "Чароўнага куфэрка", а трое — вучацца ва ўстановах сферы культуры, столькі ж — рыхтуюцца да паступлення. Мой сын, таксама студэнт, зладзіў фестывальны форум, дзе цяпер актыўна абмяркоўваюцца ўсе нашы праблемныя пытанні. Кожную заўвагу ўлічваем…

Навука пераканання

Мікалай ГРОМІК, дырэктар маладзёжнага праекта "Камянецкі драйв" (Камянец):

— Калі чалавек штосьці хоча зрабіць, дык ён гэта абавязкова зробіць. Тупіковых сітуацый не бывае. Я знайшоў спонсараў, не прасіў грошай у вобласці. І мара здзейснілася: 5 — 6 ліпеня на гарадской плошчы і на фоне Камянецкай вежы прайшоў першы рок-канцэрт з удзелам гуртоў "Beliya" (Камянец), "Садь", "Драмрокстудыа", "Сьцяна", "Ландау" (Брэст), "Skaynet" (Бабруйск), "J-МОРС", "Дразды" (Мінск).

Ёсць такая навука: пераконваць. На жаль, няма яе ў нашых навучальных праграмах. А ў сферы культуры без такога навыку проста не абысціся. Дык вось, людзей трэба пераканаць у карыснасці справы, якую робіш. А калісьці ж і такое было: у 1960-х арганізатар першага расійскага рок-фестывалю сеў у турму… Сёння там-сям таксама баяцца слова "рок": вакол яго, маўляў, толькі наркотыкі ды разбэшчанасць. Я супраць такога прымітывізму. Сённяшнюю моладзь трэба выхоўваць, у тым ліку — і на добрай музыцы…

Дык вось, наконт пераканання. Я знайшоў спонсара і пераканаў яго, што моладзі патрэбны не піва і долары, давёў, якія гурты прыедуць і з якой мэтай. Пераканаў. Сваіх сродкаў уклалі больш за 30 мільёнаў рублёў, спонсар даў звыш 20 мільёнаў.

Мікалай Громік: "Наконт пераканання. **Я знайшоў спонсара і пераканаў яго**, што моладзі патрэбны не піва і долары, давёў, якія гурты прыедуць і з якой мэтай. Пераканаў. Сваіх сродкаў уклалі больш за 30 мільёнаў рублёў, спонсар даў звыш 20 мільёнаў".

Праблем, натуральна, шмат. Паколькі глядацкая аўдыторыя не абмяжоўвалася Камянцом, трэба было думаць, як гасцям дабрацца ўночы дахаты. Усе гэтыя транспартныя пытанні трэба надалей нейкім чынам узгадняць, вырашаць і ўдасканальваць...

Агароджа глядзельнай зоны была нескладанай: сігнальная стужка па перыметры, які ахоўвала міліцыя. Ніхто праз стужку нават і не спрабаваў лезці. Білет на адзін канцэрт каштаваў 50 тысяч рублёў. Хтосьці казаў: "Дорага!" Я адказваў, што ўпакоўка пап-корна каштуе 20 тысяч… Мерапрыемства не стала самаакупным. Для гэтага трэба адпрацоўваць і ўдасканальваць праект не адзін год. Дый ці варта мераць культуру рублём? Яна павінна выхоўваць, у тым ліку — і якаснай рок-музыкай. І старт ужо дадзены. У наступным годзе праект займее працяг. Абяцалі быць каманды з Украіны...

Цудоўна разумею, якая адказнасць на маіх плячах. Але добра ведаю, што калі ўзяўся за справу, дык трэба даводзіць яе да ладу…

Можна абысціся і без спонсара

Ірына МІРОНЫЧАВА, дырэктар Міжнароднага фестывалю юных талентаў "Зямля пад белымі крыламі" (Мазыр):

— Чарговы, дзевяты, фестываль адбудзецца ў красавіку 2015-га. Ладзім яго раз у два гады. На шчасце, рэжысёрска-пастановачная група, што распачала дзейнасць у 1998-м, збольшага захавалася. Мы вучылі-ся на памылках, што і дало магчымасць для пастаяннага ўдасканалення. Рэжысура свята не паўтараецца.

Методыка фэсту цалкам прыстасавана для ўмоў Мазыра. Прымаем 600 удзельнікаў з 15 краін свету і маем магчымасць з пэўным камфортам іх размясціць, ладзіць для іх паўнацэнныя экскурсіі, арганізоўваць умовы для рэпетыцый. Так што госці не толькі спаборнічаюць, але і адпачываюць на нашай гасцінная зямлі. Адмоўных водгукаў не было.

Праблема адна: вялікі аб'ём працы. Але гэта — дадзенасць, звычайны будзень нашай працы. Імкнёмся рацыянальна размеркаваць сілы. З калектывамі цягам фестывальных дзён працуюць куратары-валанцёры. Адпрацаваны і спрыяльны рэпетыцыйны графік…

Схема фінансавання — наступная: бюджэтныя грошы (абласныя і раённыя) і даходная частка "Зямлі пад белымі крыламі" (узносы ўдзельнікаў, за пяць дзён — 20 еўра з кожнага). Пэўныя фестывальныя сродкі закладзены і ў Комплексную праграму развіцця Прыпяцкага рэгіёна. Адкрыццё і закрыццё фэсту, а таксама гасцявы канцэрт — платныя. У фестывалю вельмі неблагая даходная частка. Яна акупляе пражыванне, харчаванне, выкарыстанне абсталявання. Абыходзімся без спонсараў. Менавіта пры спонсарскай дапамозе ў нас будуюцца спартыўныя комплексы, добраўпарадкоўваецца раён…

Ірына Міронычава: "Адкрыццё і закрыццё фэсту, а таксама гасцявы канцэрт — платныя. У фестывалю **вельмі неблагая даходная частка.** Яна акупляе пражыванне, харчаванне, выкарыстанне абсталявання".

Вы ведаеце, што наш фэст спачатку прыцягваў увагу да постчарнобыльскага Палесся. Цяпер ідэя мерапрыемства іншая: "Я люблю цябе, жыццё!". І буслы вярнуліся, і само стаўленне да праблемы крыху змянілася ў бок больш пазітыўны. Не, слёзы ёсць. Але ўзнікаюць яны на вачах членаў журы ад радасці за нашы юныя таленты. І слёзы гэтыя — таксама ацэнка нашых фестывальных стараннаў…

К

Ад рэдакцыі

Цяпер зразумела, чаму далёка не кожны раён мае сваю выразную фестывальную візітоўку. Яе стварэнне — заўжды самаахвярнасць, заўжды неўнармаваная і выключна напружаная праца па перакананні апанентаў, па пераадоленні бюракратычных стэрэатыпаў і адшукванні аднадумцаў ды спонсараў. А на такое пойдзе толькі прафесіянал высокага кшталту, якога яшчэ трэба адшукаць…

Мы паспрабавалі заглыбіцца толькі ў тры творчыя лабараторыі. А ёсць жа яшчэ і знакамітыя "Берагіня", "Дняпроўскія галасы ў Дуброўне", "Гучаць цымбалы і гармонік"… Рубрыка "Форум" паспрабуе адшукаць алгарытмы і гэтых удалых творчых знаходак фестывальнай "кулінарыі". Як вядома, любую складаную страву гаспадыня гатуе спачатку па чужых рэцэптах, і толькі праз час з'яўляецца аўтарскі "навадзел". "Гатуйце" і запрашайце "да стала"!..

Выстаўка "Вялікія арыгіналы" ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі прэзентуе майстроў рэдкіх відаў творчасці.

Бамонд: опера, балет

"Дуброўскі" вяртаецца ў Віцебск

Такога на "Славянскім базары ў Віцебску" яшчэ не было! У сапраўдны прайм-тайм фестывалю — у нядзелю ўвечары — у Канцэртнай зале "Віцебск" будзе паказаны мюзікл Кіма Брэйтбурга "Дуброўскі" ў выкананні... абітурыентаў, студэнтаў і выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Ініцыятарам пастаноўкі выступіла заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ірына Дарафеева, якая ўзначальвае кафедру мастацтва эстрады БДУКіМ (яна сёлета стала старшынёй журы Міжнароднага конкурсу ў фестывальным Віцебску). Прэм'ера ладзілася на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра напрыканцы навучальнага года. У цэхах тэатра вырабляліся дэкарацыі, бутафорыя і сцэнічныя строі. У рэпертуары спектакль, як плануецца, захаваецца на некалькі гадоў. Тым больш, што ўвага публікі да пастаноўкі — вялікая. І не толькі ў сталіцы! Днямі "Дуброўскі" з вялікім поспехам прэзентаваўся ў Бабруйску, ёсць прапановы паказваць яго ў іншых гарадах Беларусі, вывозіць у Расію. І гэта цудоўна! Галоўнае — няма сумневу, што ўсё запланаванае абавязкова ажыццявіцца. Залогам таму — на здзіўленне высокія, цягам трох з паловай гадоў пасля прэм'еры, рэйтынгі мюзікла "Блакітная камея" тых жа аўтараў на той жа сцэне. І гэта пры тым, што спектакль ідзе пад фанаграму, пра што тэатр сумленна паведамляе ў афішы. Ну а пра тое, што крытыкі паставіліся да шчаслівай гісторыі князёўны Тараканавай, мякка кажучы, крытычна, няма чаго і казаць, — у адрозненне ад публікі, якая прагне відовішча.

"Дуброўскі" не падаўся мне гэткім "зуброўскім заказнікам", хаця стваралі яго ўсё тыя ж самыя "зубры" расійскай поп-культуры: кампазітар Кім Брэйтбург (дарэчы, старшыня журы сёлетняга Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў на "Славянскім базары..."), лібрэтыст Карэн Кавалерян, рэжысёр і балетмайстар Мікалай Андросаў.

Пры ўсёй запамінальнасці мелодый (а тыя папраўдзе асядаюць у галаве), паводле драматургіі "Дуброўскі" ўяўляе з сябе "канцэрт у касцюмах", з чым той жа оперны жанр змагаўся яшчэ ў XVIII стагоддзі. Адасобленасць музычных нумароў падкрэслена і тэкстам п'есы, і пастаноўкай. Літаральна кожны нумар аздабляецца відэакліпам на экране, а завяршаецца гэткім сцэнічным стоп-кадрам, як эстрадная песня з падтанцоўкай. У параўнанні з ранейшай версіяй, увасобленай у Новасібірскім тэатры музычнай камедыі, у нас у дзеянне ўведзены Апавядальнік, які і рухае сюжэт. Музычныя ж нумары "прыпыняюць", "ілюструюць" апошні, што тыпова для расійскіх музычных спектакляў, названых мюзіклямі, у адрозненне ад амерыканскай ды еўрапейскай класікі жанру, дзе менавіта разгорнутыя музычныя сцэны становяцца вузлавымі момантамі дзеяння.



Сцэна з мюзікла "Дуброўскі". / Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Сюжэт пазіцыянаваўся як "беларускі", што адпавядае ісціне: падзеі ў рамане А.Пушкіна непарэдна закранаюць Віцебшчыну, бо ў аснову была пакладзена рэальная гісторыя тутэйшага шляхціча Астроўскага. Дарэчы, падобныя выпадкі былі не адзінкавымі: пасля падзелу Рэчы Паспалітай беларуская шляхта пазбавілася былых прывілей і павінна была дакументальна пацвярджаць свае правы на землі ды маёмасць, якія ў адваротным выпадку папросту адбіралі. Але ўсведамленне гэтай, зусім не выпадковай, трагедыі ў спектаклі няма: нам проста пераказваюць сюжэт — з некаторымі "папраўкамі" на музычна-забаўляльны жанр.

У любоўнай гісторыі таксама няма асаблівых глыбінь. Больш за тое: у ёй хапае недарэчнасцей. Цяперашняя Маша — зусім не кісейная панёнка. Калі меркаваць па музыцы ды пастаноўцы, яна вельмі тэмпераментная, ініцыятыўная, — дык чаму ж застаецца з князем Вярэйскім? Тому, што той на ейных вачах забівае (а не раніць, як у рамане) Дуброўскага? Тым больш, што Вярэйскі паказаны... блакітным, з-за чаго, кажуць, адзін са студэнтаў, паспяхова прайшоўшы кастынг, адмовіўся ад удзелу. Дадамо, што тую ж арыентацыю маюць практычна ўсе "адмоўныя" персанажы спектакля, намаляваныя выключна парадыйна (за выключэннем адно Траякурава). Ці не зашмат? Такая расстаноўка сіл, можа, і адпавядае расійскай эстраднай рэчаіснасці, але ў гістарычным спектаклі, хай і наблізжаным да сучаснай моладзі (той жа "Раманс Машы" — зусім не стылізацыя, а сучасная эстрадная песня), выклікае, па меншай меры, здзіўленне.

Увогуле, акцэнты перамяшчаюцца з дваранскага саслоўя на сялянскае, якое, праўда, атрымліваецца не зусім станоўчым. Галоўнымі дзеючымі асобамі ў спектаклі становяцца Архіп і Ягораўна: менавіта з закліку апошняй і судовых засядацеляў падпальваюць, і... Дуброўскага з Машай разлучаюць (Ягораўна баіцца, што ажаніўшыся, Дуброўскі не захоча разбойнічаць, таму падманвае яго, кажучы, па якой дарозе маладыя будуць ехаць у царкву). Дый масавыя народныя сцэны з адценнем фольку ўражваюць больш, чым лірычныя: лепшыя музычныя фрагменты — этна-рок. Ну а самі сяляне намаляваны як гэткі натоўп лайдакоў, якім лепш у лес сысці, абы не працаваць.

Тое, што зрабілі ў "Дуброўскім" нашы выкладчыкі і студэнты, выклікае сапраўдны гонар. Паглядзеўшы, з якой самааддачай, маладой энергетыкай ды бляскам у вачах яны спяваюць і танчаць, у некалькі разоў пераўзыходзячы новасібірскіх прафесійных артыстаў (фрагменты таго спектакля выкладзены ў Інтэрнэце), можна зразумець, чаму Брэйтбург зрабіў нам такі падарунак, неаднаразова паўтараючы: "Мы працавалі не дзеля грошай, а дзеля людзей".

Артысты хору перакваліфікаваліся ў танцораў: танчаць яны — нароўні з выхаванцамі харэаграфічнага аддзялення, а спяваюць — "пад плюс", зроблены са сваімі "нябачнымі" аднакурснікамі, беручы прыклад не з заходніх мюзіклаў, а з расійскай эстрады. Салісты працуюць "жыўцом" — і вельмі добра (літаральна некалькі "няўстойлівых" нот, што былі на прэм'еры, тлумачацца хваляваннем пачаткоўцаў і стомленасцю на фінішы марафону). Эстрадна-сімфанічны аркестр на чале з Анатолем Кудзіным размешчаны на сцэне і выконвае ролю "дадатковай сцэнаграфіі". Струннікаў — безліч, і граюць яны надзвычай заўзята. Духавікі сядзяць "лесвічкай" на станках, бы ў амфітэатры, раз-пораз эмацыйна ўзнімаючы інструменты ўгару. А чуем мы — пераважна электроніку, што ідзе ў запісе. Але сама па сабе аранжыроўка — на парадак вышэйшая за тую, што ў "... Камеі".

Спектакль — папраўдзе "драйвавы", але яго экспрэсіянізм, асабліва ў сцэнічным маўленні, — патыхае "жарсцямі" 1950-х: усё — у састарэлай, надта "тэатралізаванай" манеры, без "кіношнай" натуральнасці, уласцівай сучаснасці. Але студэнтам такі сцэнічны вопыт — што называецца, "у кайф", публіка — у экстазе. Кіраўнік праекта, рэктар БДУКіМ Юрый Бондар, — задаволены: студэнтам — практыка (у тым ліку і будучым менеджарам, прадзюсарам ды ўсім, хто правёў "раскрутку"), сумесны маладзёжны беларуска-расійскі праект — на самаакупнасці, як паведамілі на прэс-канферэнцыі. Больш нічога і не трэба?..

К

Раскадроўка

Гісторыя Мілы

Наша зямля ўрадлівая на цікавых асоб. Міла Ануфрыева — асоба звышцікавая. Скончыўшы школу ў правінцыйным Шклове, у самы разгар перабудовы яна прыехала скараць Ленінград. А ў выніку заваявала не толькі Пецярбург і Маскву, але і Мілан, і Венецыю, ды працягвае скараць сэрцы ўсіх прыхільнікаў прыгожага ладу жыцця. Таму што па-іншаму, як толькі ўпартай барацьбой за месца пад сонцам, у свеце "высокай моды" не выжыць.

Антон СІДАРЭНКА

Ад Шклова да Мілана: цікавыя дзвюхтысячныя

страшным захворваннем, здолела ачуняць ад усіх бедаў і навалаў ды пачаць жыццё і бізнес з абсалютнага нуля ў чужой краіне, да таго ж яшчэ і ўтрымліваючы мужа ды двух маленькіх сыноў. Але рэжысёр-дакументаліст Надзея Гаркунова абрала іншы жанр. І мела рацыю.

Кінапартэрт Міры Ануфрыевай атрымаўся не надта працяглы па часе, затое — ёмісты і вычарпальны. А ўсё таму, што рэжысёр не пашкадавала часу і высілкаў ды аб'ехала ўсе гарады і краіны, дзе калісьці жыла і працавала яе гераіня (ад роднай хаты ў Шклове да цяперашніх апартаментаў у Мілане), ды папрасіла расповесці пра гісторыю Мілы яе сяброў і родных.

Атрымалася насычана і цікава. Хоць сама гісторыя Мілы Ануфрыевай далёка не завершана. Уся інтрыга стужкі "Signora Russa" ("руская сінёра", менавіта так называюць яе сябры-італьянцы) — у "падвешаным" лёсе галоўнай гераіні, у дынамізме, з якім разгортваецца яе жыццёвая драма, і ў тым, з якой сілай і неверагоднай годнасцю Міла вырашае свае праблемы.

Менавіта гэтую сілу ды годнасць здолела ўлавіць Надзея Гаркунова і перадаць на экране ў размовах са сваёй гераіняй. І тое, што цёмныя акуляры ды нязменная ўсмешка бізнес-лэдзі не перашкаджаюць убачыць за імі боль і жыццёвую трагедыю — заслуга менавіта рэжысёра ды выдатнага аператара Аляксандра Яршова. Як і тое, што самыя цяжкія моманты жыцця Мілы Ануфрыевай пададзены ў фільме максімальна тактоўна. Яно і не дзіва: Надзея Гаркунова — вельмі даследчаны і неверагодна праніклівы інтэрв'юер, з велізарным досведам працы з самымі вядомымі персонамі. І да сваёй гераіні ды яе шакуючай гісторыі яна падыходзіць тактоўна, але з інстынктам сучаснага мастака, выбіраючы самыя галоўныя, самыя паказальныя месцы. Як у самым запамінальным эпізодзе на знакамітай плошчы Сан-Марка ў Венецыі, дзе разнамасны натоўп і вечнае свята жыцця толькі падкрэсліваюць унутраную адзіноту моцнай і незалежнай асобы…

Індустрыя стылю і прыгажосці, адваротны бок якой давялося пабачыць гераіні "Signora Russa", добра ўспрыняла фільм Надзеі Гаркуновай. Асобная прэм'ера адбылася ў Мілане, дзе бліскучая публіка — сябры і бізнес-партнёры Мілы Ануфрыевай — вельмі эмацыйна ўспрыняла кінаверсію гісторыі сваёй сяброўкі. З энтузіязмам паглядзелі сенсацыйную карціну і на асобных паказах у Мінску. Хочацца спадзявацца, што "Signora Russa" будзе не толькі распаўсюджвацца ў прыгожых дызайнерскіх канвертах у спецыяльна распрацаваным фірмовым стылі (выпадак для нашага кіно ўнікальны), але і паказана па тэлебачанні. Дый працяг гісторыі, якая зусім яшчэ не скончана, напрошваецца сам сабой.

А пакуль унікальнасць гісторыі жыцця Мілы Ануфрыевай і высокі ўзровень рэжысёрскай работы Надзеі Гаркуновай пацвердзіла навіна з далёкай Каліфорніі: на прадстаўнічым Фестывалі кіно, тэлебачання і медыя-мастацтва "Accolade Competition" дакументальны фільм "Signora Russa" атрымаў узнагароду "Awards of Excellence".

Зрэшты, і без узнагарод ды прызоў гэтая стужка вартая да прагляду.

К

Да 19 ліпеня ў сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва паказваюць калекцыю жывапісу **абстрактнага экспрэсіянізму**.

У Магілёве да Дня горада, які адзначаецца 28 чэрвеня, культурны абшар папоўніўся выставачнай залай. Як ні дзіўна, але пры наўянасці вядомых на ўсю краіну музеяў (адзін з іх — Мастацкі, нават выяўлены на грашовай купюры) абласны цэнтр пэўны час не меў агульнагарадской залы, адмыслова абсталяванай для зменных экспазіцый. Дакладней, фармальна такая зала існавала, але па прызначэнні не скарыстоўвалася. Бо даўно не рамантавалася, яе абсталяванне і дызайн састарэлі маральна і фізічна, яна была эканамічна нерэнтабельнай і не мела руплівага гаспадара.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ
Мінск — Магілёў — Мінск

А.Вераб'ёў. "Узвышшанае і зямное".

А.Ёўдакімєнка. "Горад".

Магілёў — гэта...

Тры месяцы таму такі гаспадар з'явіўся — Музей гісторыі Магілёва, а з гарадскога бюджэту былі выдаткаваны сродкі на рэканструкцыю памяшкання. Каштавала рэканструкцыя 3,5 мільярда рублёў. За даволі кароткі тэрмін залу не толькі давялі да ладу, але і пашырылі за кошт сумежнага памяшкання. Цяпер тут акрамя экспазіцыйнай прасторы ёсць невялікі салон, дзе можна набыць творы мастакоў Магілёўшчыны. Умовы экспанавання ў зале такія, што тут можна выстаўляць нават музейныя рэчы, якім неабходны спецыяльны рэжым захоўвання. Магіляўчане не без падстаў лічаць, што пасля рэканструкцыі іх выставачная зала стала адной з лепшых у краіне.

Першая выстаўка ў абноўленай зале — рэтраспектыва твораў магілёўскіх мастакоў апошняга дзесяцігоддзя. Аднак, па аналогіі з кінематографам, дзе, каб прывабіць публіку, трэба арганізаваць удзел у фільме "зорак", арганізатары выстаўкі аздобілі экспазіцыю творамі славутых землякоў, чые імёны ўжо належаць гісторыі мастацтва — беларускай, расійскай, сусветнай. Гэта Павел Масленікаў, Вітольд Бялыніцкі-Біруля, Марк Шагал. Апошні прадстаўлены графічнымі работамі. Адносна Шагала могуць запярэчыць: ён, маўляў, — віцябчанін. Але, па-першае, аўтарытэтныя мастацтвазнаўцы прызнаюць наяўнасць у гісторыі культуры такой з'явы, як Віцебска-Магілёўская мастацкая школа. Па-другое, існуе меркаванне, што дзед Шагала, які, мяркуюць, даў унуку асновы мастацкай граматы, распісваў у Магілёве сінагогу і праз гэта спрычыніўся да культурнай гісторыі горада.

Леніна Сіваакова. "Птушкі".

Г.Конанава. "Новае. Прэм'ера (Магілёўскі драматычны тэатр)".

М.Несцярчук. "Майскі сад".

Славутыя імёны ў мінуўшчыне — гэта добра, а што наконт дня сённяшняга? Мяркуючы па экспазіцыі, якая, на маю думку, даволі аб'ектыўна адлюстроўвае творчы патэнцыял магілёўскіх мастакоў, таленавітых людзей у Прыдняпроўі — нямала. Але чагосьці надзвычайнага, "выбухоўага" — такога, каб, пабачыўшы твор на выстаўцы, занурыцца ў Сеціва, адшукаць іншыя работы пэўнага аўтара, я ў экспазіцыі не заўважыў.

Уводная яе частка складаецца з твораў, якія так ці інакш можна аднесці да тэмы 70-й гадавіны Вызвалення. Гэта партрэты ветэранаў, а таксама рэаліі і сімвалы нашага мірнага жыцця, за якое дзяды нашы пралівалі кроў. Далей — сюжэтныя карціны, нацюрморты, партрэты, што могуць задаволіць густы самых розных гледачоў, выхаваных на традыцыях рэалізму.

Нешта падобнае можна пабачыць на выстаўках у іншых абласных цэнтрах Беларусі і на рэспубліканскіх мастацкіх імпрэзах у сталічным Палацы мастацтва. Адно мне падаецца, што Магілёў як сталіца значнага культурна-гістарычнага рэгіёна знаходзіцца ў пошуку сваёй тэмы, уласнага брэнда, які вылучаў бы яго сярод іншых гарадоў ды мясцін нашай краіны. Скажам, віцебскія мастакі актыўна эксплуатуюць спадчыну Шагала і Малевіча, часам даволі ўдала адаптуючы эстэтыку рэвалюцыйнага авангарда да нашай культурнай рэчаіснасці. У Гродне ў пашане беларускае Сярэднявечча. Гродзенцы ўжо нямала зрабілі для вяртання ў грамадскую свядомасць і ў нацыянальную культурную прастору імёнаў ваяроў, дзяржаўных дзеячаў, навукоўцаў і людзей культуры Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай дый надалей шчыруюць у гэтым напрамку. Шматзначная, шматпланавая тэма

На шляху да тоеснасці рэгіёна

сапраўдную цану простых каштоўнасцей жыцця.

Скульптура ў экспазіцыі запомнілася работамі Аляксандра Мінькова, Уладзіміра Конанава, Андрэя Вераб'ёва. Для гэтых мастакоў пластыка — як выйсце ў іншую рэальнасць. Вобразна кажучы, яны не адлюстроўваюць матэрыяльны свет, але імкнуцца да матэрыялізацыі думак і эмоцый. Яно, зразумела, цяжэй, чым "працаваць люстэркам". На гэтым шляху больш, чым на пратаптанай дарозе рэалістычнай ілюзіі, шанцуў спатыкнуцца, але рызыка — натуральны чыннік творчасці.

Увогуле, экспазіцыя ў адноўленай выставачнай зале Магілёва — цікавая. І для жыхароў горада, і для тых, хто неабыякавы да культурнага стану рэгіёнаў. Добра ўжо тое, што яна паставіла перад культурнай грамадой пэўныя пытанні. І першае сярод іх, як мне падаецца, — неабходнасць пошуку сваёй, магілёўскай, тоеснасці. Само ж абмеркаванне выстаўкі — гэта ўжо крок у названым напрамку.

К

З 15 ліпеня ў Палацы мастацтва — выстаўка літоўскіх мастакоў да 300-годдзя з дня нараджэння **Крысціёнаса Данелайціса**.

Бярозаўшчына: аптымізацыя, мемарыялізацыя, рэстаўрацыя…

Акцыя "К": журналісцкі аўтапрабег па СДК і не толькі

Брама неўміручасці, або

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Памяшканняў хапае, каб працавалі музычнае, харэаграфічнае, мастацкае аддзяленні. Маюцца камп'ютары, мультымедыйная ўстаноўка для віртуальных вандровак па тэатрах і галерэях свету. Ёсць дванаццаць педагагічных музкалектываў (!) самых розных жанравых кірункаў і тры дзіцячыя ўзорныя ансамблі. І гэтыя ансамблі пастаянна займаюць па Беларусі лідзіруючыя месцы. Прыкладна з дзесяці дзяцей восем вяртаюцца з лаўрэацкімі дыпломамі. Кіраўнік установы лічыць, што гэты паказчык і адлюстроўвае эфектыўнасць працы ДШМ.

Транспарт для таго, каб трапіць на конкурс, забяспечвае аддзел. Дзеці абавязкова заахвочваюцца. Летам па нядзелях у Бярозе ладзіцца культурна-асветніцкая акцыя "Летнія вечары на плошчы". Кожны калектыў (па плане, распрацаваным з зімы) абавязкова "засвечваецца" на гарадской плошчы.

У раёне — пяць школ мастацтваў. У бярозаўскай — два сельскія філіялы. А ёсць жа яшчэ і Белаазёрск, які таксама мае права называцца раённай культурнай сталіцай. Там таксама ёсць школа мастацтваў са сваімі філіяламі. Шкада, але да Белаазёрска тым днём мы так і не дабраліся. Але, па словах начальніка аддзела Тацціяны Кавалёк, там таксама — поўны ажур.

Выснова — наступная. Школы мастацтваў, як і музычныя школы, — па нашым меркаванні, найбольш, так бы мовіць, стрэсаўстойлівая структура культурнай сферы. І заробкі тут вышэйшыя, і з кадрамі праблем няма, і ананімкі на начальства — справа рэдкая… А ўсё чаму? Ды таму, што ДШМ — навучальная ўстанова і па ранжыры стаіць бліжэй да сферы адукацыі, чым да культуры. А там, у адукацыі, і прававая база — належная, і перспектывы — вядомыя, і прэстыж прафесіі — хоць у нейкай ды наяўнасці. Мы разумеем, што параўноўваць адукацыю і культуру — што ставіць побач двух жабракоў. Але большы жаль выклікае ўсё ж культура. Хто памятае, калі апошнім разам павышаліся заробкі яе работнікам?..

Бярозаўская брама.

Радыстка Кэт і іншыя…

Чарговы "гід" па культуры раёнтра — дырэктар Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея Любоў Ківатыцкая. На тэхнічным узбраенні ўстановы — шэсць камп'ютараў і дзве мультымедыйныя ўстаноўкі. Але, як высветлілася, не гэтае начынне адыгрывае галоўную ролю ў справе прыцягнення шматлікіх турыстаў, а сучасны падыход да экскурсійна-асветніцкай дзейнасці ўстановы. Цяпер пад час экскурсій у музеі не засумуеш: сур'ёзная гістарычная інфармацыя "разбаўляецца" адметнымі ролевымі гульнямі, прадугледжанымі ў рамках новых праектаў "Бярозаўскі кірмаш" (праз гульню госці музея знаёмяцца з народнымі рамёствамі) і "З глыбінь народнай спадчыны". Апошні прысвечаны адметнасцям народнага календара, абярэгам і мясцовай гаворцы. Надаецца ў музеі ўвага і рыцарскай культуры. І хоць рэканструкцыі рыцарскіх турніраў тут пакуль не ажыццяўляюцца, але, прынамсі, праверыць сваю трапнасць можа кожны ахвотны — страляючы з лука па мішэнях у філіяле ўстановы: Галерэі мастацтваў. Нарэшце, самы папулярны праект музея — "Лясная партызанская школа". Праект, пра які ў свой час пісала "К", з'явіўся ў 2006 годзе і дзейнічаў пэўны час. Цяпер "Лясная партызанская школа" адраджаецца ў новай выставачнай зале — 20 ліпеня чакаецца яе адкрыццё.

Прыемна адзначыць, што музей для папаўнення экспанатаў не абмяжоўваецца дапамогай Міністэрства культуры і Дзяржаўнага мытнага камітэта (усяго ў музей трапілі 48 ікон, канфіскаваных на дзяржаўнай мяжы). Працягваецца супрацоўніцтва з мясцовым краязнаўцам, які зараз жыве ў Чэхіі. У архівах даследчык робіць пошукі, плённыя вынікі якіх выкарыстоўваюцца ў навукова-экспазіцыйнай рабоце музея. Дзякуючы апошняй сёлетняй канферэнцыі наладжана супрацоўніцтва і з польскім навукоўцам. Ён займаецца вывучэннем мінулага Бярозы. Словам, музей жыве, папаўняецца цікавымі прадметамі, сярод якіх уражваюць паўкілаграмовы кавалак бурштыну, знойдзены ў адных з крэйдавых кар'ераў раёна, багаты скарб XVI стагоддзя, скульптуры з колішняга кляштара, трафеі, вывезеныя ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны з Рэйхстага.

Адно шкада: пакуль у новых экспазіцыйных залах анатацыі афармлены выключна на рускай мове…

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

Мне ў Бярозаўскім музеі спадабалася. Шчыра скажу, да аналагічных раённых устаноў стаўлюся трохі скептычна. Цудоўна ведаю, што многім з іх хранічна бракуе арыгінальнай канцэпцыі, прадуманай музейнай "драматургіі". У такіх музеях, як мы пісалі ўжо, рэй вядуць пабіты моллю воўк ды набыты па бартары "карыесны" мамантавы бівень. Бяроза ж сябе паважае. І справа не толькі ў тым, што на шляху ад ДШМ да музея не было мінака, які не павітаўся б з Любоўю Ківатыцкай… Справа — у з'яднанасці музейнай каманды, дзе нават прыбіральшчыца пад час тэатралізацый — Радыстка Кэт. А ў выніку новая экспазіцыя ўражвае ўнікальнасцю экспанатаў, звязаных са старадаўняй гісторыяй, з мінулай вайной. Мяне, да прыкладу, кранулі баявыя ўзнагароды і савецкая зброя, асобныя мадэлі якой у іншых музеях бачыць не давялося. Кожная рэч — на сваім месцы, а музейная лагістыка выверана да драбніц. Не лічу сябе вялікім му-

На людным месцы

А купальскі вянок — на пяць метраў!

6 ліпеня Вязынка збірала гасцей на свята паэзіі, песні і народных рамёстваў "З адною думкаю аб шчасці Беларусі…", якім штогод на пачатку ліпеня адзначаюць дзень нараджэння Янкі Купалы.

Удзельніцы свята.

Вянок-рэкардсмен.

МАЛАДЗЕЧАНШЧЫНА

Традыцыя свята паэзіі ў Вязынцы была закладзена ў 1972-м, і ёсць нямала яго сталых гасцей з тых самых часоў. Дый сёлета сотні людзей сем'ямі ды кампаніямі сабраліся на свята, якое Дзяржаўны літаратурны музей класіка зладзіў сумесна з Маладзечанскім райвыканкамам і Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Сёлета з'явіліся і новыя партнёры: "Альфа-банк", а таксама Асацыяцыя "Прафесіяналы фларыстыкі і кветкавага бізнесу", што выступіла адным з удзельнікаў святкавання. Менавіта члены апошняй падрыхтавалі кветкавы этнафестываль, у час якога з дапамогай майстроў-фларыстаў кожны ахвотны мог далучыцца да традыцыі, ствараючы купальскі вянок.

Ля музея ў Вязынцы гасцей вітала кампазіцыя з кветак і траў. У надпісе "Купалле", што размяцілася над рачным схілам паблізу свірна, літара "А" складалася з адмыслова падабраных белых хрызантэм. У купальскіх вянках ды букетах валошка і рамонак гарманічна спалучаліся з вытанчанымі аранжарэйнымі кветкамі. Кожны ж госць свята ў Вязынцы, які прыйшоў у нацыянальным строі, атрымаў вяночак у падарунак.

Аб 11-й быў дадзены старт пляценню самага вялікага купальскага вянка ў Беларусі з удзелам не толькі прафесіяналаў, але і ўсіх ахвотных. Ну а майстар-класы па пляценні купальскіх вянкоў былі арганізаваны для самых маленькіх гасцей свята. Дзіцячыя работы ацанілі на конкурсе "Красачка Купалля", а дарослыя — пад час конкурсу-дэфіле "Краса Купалля".

Для гасцей свята была падрыхтавана насычаная канцэртная праграма. Святочны канцэрт распачалі Андрэй Скарынкін і колішняя салістка "Песняроў" Людміла Ісупава, у чыім выкананні прагучалі песні на словы Янкі Купалы "Над калыскай" і "Спадчына". Затым выступалі ўдзельнікі вакальнага ансамбля "Асалода" Раёўскага дома культуры, народны фальклорны ансамбль "Маркаўчанка" Маркаўскага дома культуры, народны ансамбль музыкі і танца "Вязанка". Запомнілася і выступленне даўніх сяброў нашага музея — фальклорнага калектыву Музея-запаведніка Аляксандра Пушкіна "Міхайлаўскае", які пазнаёміў з купальскімі традыцыямі, абрадамі і песнямі Пскоўшчыны. Прыемным сюрпрызам

Выстаўка твораў знакамітага беларускага мастака **Пятра Сергіевіча** ідзе ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы.

Дырэктар Бярозаўскага музея Любоў Ківатыцкая.

Бібліятэкар са Стрыгіні Святлана Пунько.

На пытанні адказвае прараб "Брэстрэстаўрацыі" Вячаслаў Кучаравы.

Прыгоды гарынскай цэглы

зейным крытыкам, але ўсё ж нарадзіўся і вырас у Ветцы, музейная традыцыя якой дапамагла зрабіць выснову: установа Бярозы шмат каго можа павучыць...

"Новае" жыццё "старога" будматэрыялу

Цвёрда вырашылі: калі не здолеем сустрэцца з рэстаўратарамі, матэрыял пра культурны клопат Бярозы будзе непаўнацэнным. Тым больш, гаворка вядзецца пра аднаўленне гербавага сімвала — кляштарнай брамы, узвядзенне якой ініцыяваў сам Леў Сапега.

Аб'ект знайшлі хутка і пераканаліся, што работы на ім вядуцца самыя актыўныя. Як распавёў прараб "Брэстрэстаўрацыі" Вячаслаў Кучаравы, да зімы рэстаўратарам неабходна завяршыць працу на браме манастыра, а гэта вельмі няпроста з улікам таго, што першасны праект рэстаўрацыі рабіўся ажно ў 2007 годзе, — за гэты час стан аб'екта заўважна пагоршыўся. У выніку, сёлета экспертам давялося працаваць паралельна з рэстаўратарамі.

У час размовы закранулі і тэму будаўнічых матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца пры рэстаўрацыі. Здавалася, у краіне толькі адзін завод вырабляе рэстаўрацыйную цэглу. Яе і варта выкарыстоўваць. Але ж не: "Брэстрэстаўрацыя" столінскую цэглу не выкарыстоўвае, абгрунтоўваючы гэта неналежнай якасцю апошняй. Справа ў тым, што пятнаццаць гадоў таму цэгла з пасёлка Рэчыца, што пад Столінам, выкарыстоўвалася пры рэстаўрацыі Ружанскага палаца — за дзесяцігоддзе яна літаральна развалілася… Таму ўзамен яе цяпер выкарыстоўваецца звычайная цэгла, якая адпавядае пэўным крытэрыям.

Па прыездзе ў Мінск датэлефанаваліся да Гарынскага камбіната будаўнічых матэрыялаў. Начальнік аддзела маркетынгу прадпрыемства Дзмітрый Вабішчэвіч патлумачыў, што ўзровень якасці цэглы пятнаццацігадовай даўніны і сённяшні — непараўнальны: у 2009 — 2010 гадах на прадпрыемстве адбылася мадэрнізацыя вытворчасці з устаноўкай новай тэхналагічнай лініі. На яе базе пасля навуковых эксперыментаў і была створана лінія па вытворчасці рэстаўрацыйнай цэглы, што прадугледжвае зусім іншы рэжым абпальвання і сушкі. Вядома, пры вытворчасці сустракаецца і бракаваная прадукцыя, якая ідзе не на рэстаўрацыю замкаў, а на другасную перапрацоўку.

Чаму ж тады ўзніклі такія перасцярогі ў брэсцкіх рэстаўратараў? Няўжо яны не чулі пра новую цэглу? Дзмітрый Вабішчэвіч пагадзіўся, што рэкламы новай прадукцыі Гарынскага КБМа практычна нідзе не сустрэнеш. Прычына адна: усе замовы на пастаўкі рэстаўрацыйнай цэглы на гістарычныя аб'екты ідуць не праз "Белрэстаўрацыю", а праз Міністэрства культуры, якое, між іншым, і падштурхнула прадпрыемства вырабляць унікальны будаўнічы матэрыял. Калі ж рэстаўрацыйная цэгла прайшла ўсе неабходныя выпрабаванні і экспертызы, то чаму яе не выкарыстоўваць на большасці аб'ектах нашай архітэктурнай спадчыны? На жаль, пытанне гэтае застаецца адкрытым…

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

Пабываўшы ў Бярозе, пераканаўся: турыстычная прывабнасць горада ствараецца не толькі праз гістарычныя аб'екты, але і праз стаўленне мясцовай улады да культуры. Ці часта, скажам, на мінскіх плошчах гучыць жывая класічная музыка ў выкананні калектываў з музычных школ, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў? А ў Бярозе гучыць! І збірае вакол сябе багата неабыякавых гараджан, таксама як і турыстаў…

Выканкамаўскі "філіял"

У аддзеле нам параілі па дарозе на Мінск заехаць у вёску Стрыгінь. Маўляў, там вельмі неблагая бібліятэка. Мы заехалі — і не пашкадавалі. Гаспадыня ўстановы Святлана Пунько распавяла нам пра прыярытэтны краязнаўчы кірунак. Мы спачатку былі засумавалі: гэты кірунак ці не ў кожнай сельскай бібліятэцы — прыярытэтны. А потым на ўласныя вочы пераканаліся, што да справы Святлана Мікалаеўна ставіцца з выключнай адказнасцю.

Пры ўстанове існуе клуб "Вытокі", да членаў якога смела можна аднесці ці не ўсё насельніцтва вёскі: настаўнікаў, рабочых, механізатараў, школьнікаў… Усе разам яны даследуюць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, лёсы загінулых землякоў. На паліцах, прысвечаных дзейнасці "Вытокаў", — каля тысячы фотаздымкаў, 254 рэчы: узнагароды ветэранаў, каскі, пісьмовыя ўспаміны, салдацкае ліставанне — знакамітыя трохкутнічкі, змест якіх проста разрывае душу… Такія ж трохкутнічкі вучацца рабіць школьнікі малодшых класаў. Пра што яны думаюць пры гэтым?..

І рарытэты і наватворы аб'яднаны адзінай летапіснай прасторай: гэта бясконцыя аркушы паперы, дзе мінуўшчына і сучаснасць мудрагеліста пераплецены, як і ў сапраўдным жыцці. Пачынаеш на стале чытальні разгортваць гэтае жыццё — і літаральна патанаеш у эмоцыях… Святлана Пунько перажывае, што ўвесь матэрыял яшчэ не пераведзены на "лічбу". Але ж у такім выпадку можна згубіць шчымлівы дотык да сапраўднага франтавога ліста, пракаментаванага сённяшнімі спадкаемцамі вызваліцеляў…

Яшчэ адзін бібліятэчны эксклюзіў, з якім раней не сутыкаліся. Да Святланы Пунько завітала кіраўнік справамі сельвыканкама Жанна Вакуліна. Завітала планава, бо назвала бібліятэку — выканкамаўскім філіялам. Пунько, маўляў, і кніжныя выстаўкі пад час сельсаветаўскіх сесій ладзіць, і сустрэчы з ветэранамі вайны арганізоўвае. Словам, як можа пашырае межы бібліятэчнага ўплыву. Больш чым ухвальна…

З кіраўніцтвам сельскага клуба не давялося пабачыцца (кіраўніца была на вучобе), а вось з этнамузейчыкам, размешчаным у клубным фае, пазнаёміліся. Ён таксама ўражвае разнастайнасцю рэчаў сялянскага побыту. Адзіная заўвага: пэўныя найменні экспанатаў напісаны беларускімі літарамі па-руску. Можна было б і ўзгадніць правапіс з "Вытокамі", сярод членаў якіх ёсць і настаўнікі роднай мовы. Але гэты недахоп, як кажуць, з ліку хуткавыпраўляемых…

Пад спякотным майскім небам рушым дахаты і слухаем Паліну Рэспубліку…

Агульнае (не)лірычнае заканчэнне

Кожны аўтатур мы называем чатырохдзённымі курсамі павышэння ўласнай кваліфікацыі. Наш чарговы аўтаваяж завершаны. Пасля яго, як і заўжды, адчуваем тое, што ведаем яшчэ мала. Таму зноў цягне павучыцца. На крэатыўным досведзе, на чужых памылках. Паверце, вельмі хочацца, каб першага было больш, а другіх — не існавала б увогуле. Гэтая вера і штурхае штораз у дарогу. Таму ў бліжэйшы час маем намер ізноў выправіцца ў вандроўку. Сустрэнемся!

Фота аўтараў К

для дзетак стаў лялечны спектакль паводле пушкінскай "Казкі пра рыбака і рыбку", падрыхтаваны супрацоўнікамі "Міхайлаўскага".

І, безумоўна, гучалі вершы. Радкі Купалавых вершаў чаргаваліся з вершамі сучасных беларускіх паэтаў. А напрыканцы канцэрта прагучаў фрагмент рок-оперы "Гусляр" паводле паэмы Янкі Купалы "Курган" — маналог Гуслярa ў выкананні Андрэя Скарынкіна, аўтара і кіраўніка праекта па аднаўленні рок-оперы "Курган", упершыню ўвасобленай славутымі "Песнярамі". Завяршыла канцэрт велічная і кранальная "Малітва" Янкі Купалы на музыку Алега Молчана.

У гэты дзень на тэрыторыі запаведніка разгарнуўся і вясёлы кірмаш вырабаў ад народных майстроў Міншчыны. А кульмінацыяй свята стаў момант, калі грандыёзны купальскі вянок дыяметрам пяць метраў быў адпушчаны ў свой шлях па хвалях ракі Вязынкі…

Галіна ВАРОНАВА, вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы
Фота Ягора ГАРАЯ і Марыі БАРТКОВАЙ

Толькі два-тры колеры і…

Мастацтва жыве побач з намі. "Пасялілася" яно і ў бібліятэцы г.п. Радашковічы. Менавіта там адкрылася выстаўка "Людзі вакол, або 13…" маладога мастака Сяргея Шчамялёва.

РАДАШКОВІЧЫ

Бібліятэка не ўпершыню выступае пляцоўкай культурнага жыцця Радашковічаў: раней тут праходзілі выстаўкі работ народных майстроў, мясцовых мастакоў, неаднаразова адбываліся сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі і краязнаўцамі (сярод іх — Уладзімір Арлоў, Алена Масла, Уладзімір Содаль, Міхась Казлоўскі…). Пасля рэарганізацыі, якая прайшла летась, пры бібліятэцы сталі дзейнічаць аб'яднанне для людзей сталага ўзросту "Крыніца" і дзіцячы літаратурна-драматычны гурток "У гасцях у казкі".

Гэтым разам у чытальнай зале бібліятэкі размясцілася экспазіцыя, што налічвае 14 карцін, кожная з якіх па-свойму адметная. Пяць работ — жывапісныя, дзевяць — графічныя.

Сяргей Шчамялёў нарадзіўся ў вёсцы Булаўкі Полацкага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў мастацкую школу ў Расонах, затым — аддзяленне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа. З 2013 года ён працуе мастаком у мастацка-канструктарскім аддзеле ААТ "Белмастацкераміка", што ў Радашковічах.

Фрагмент экспазіцыі.

Мастак прымаў удзел у выстаўках рэспубліканскага і міжнароднага фармату. Апошнюю складаюць яго новыя работы, створаныя напрыканцы 2013-га — у 2014 годзе. Як адзначае сам Сяргей Шчамялёў, ягонай мэтай з'яўляецца спроба прымусіць людзей задумацца пра тое, што час — зараз, а не пасля. Недарэмна сярод беларускіх мастакоў Сяргей вылучае Міколу Селешчука і яго карціну "Не хадзі за мной, я сама заблудзіла" (1988 г.). Аўтара выстаўкі сапраўды хвалююць праблемы чалавечых узаемаадносін, сітуацыі, што выходзяць за межы побытавых, пачуцці, якія хаваюцца ў глыбінях душы…

Не абмінае Сяргей Шчамялёў і такую складаную тэму, як пытанні жыцця і смерці. Сама назва выстаўкі "Людзі вакол, або 13…", па словах яе стваральніка, можа тлумачыцца сімвалічна. Як вядома, з лічбай 13 звязаны разнастайныя забабоны ды прымхі. Чалавек у жыцці выступае як адзінка, а лічба 13 у дадзеным кантэксце набывае сэнс завершанасці ўсяго жыцця, мяжы, страху, смерці. Гэта своеасаблівы напамін, што жыццё не вечнае, і пражыць яго варта зараз.

Колькі слоў пра манеру пісьма мастака. Карціны звяртаюць на сябе ўвагу наяўнасцю шрыфтоў. У кожным творы зашыфравана пасланне нам, гледачам, якое адкрыецца толькі пільным. Мастак гаворыць з намі пра тое, што думае і адчувае сам, укладае ў карціну аповед, які схаваны, прытоены, але ад гэтага яшчэ больш цікавы. Графіка дапамагае мастаку выказвацца тады, калі для перадачы думкі неабходны мінімум колераў, а не іх бясконцае мноства. Два-тры колеры даюць магчымасць паглыбіцца ў праблему, якую хацелася б раскрыць.

Сяргей Шчамялёў заклікае кожнага з нас задумацца — пра жыццё, чалавека, лёс. І — стаць крыху лепшымі…

Марына ЧАРНЯКЕВІЧ, бібліятэкар Радашковіцкай гарпасялковай бібліятэкі

Кобрын прыме I Міжнародны фестываль-конкурс **інклюзіўнай творчасці** "Пад крыламі Арыёна" 31 ліпеня — 6 жніўня.

Стратэгія начальніка аддзела

Шуміліншчына — край шматлікіх самадзейных калектываў, няўрымслівых бібліятэкараў, што шануюць чытача і вырошчваюць побач з кніжнымі паліцамі зімовы сад, край адмысловых рамеснікаў, якія славяцца не толькі задымленым гліняным посудам...

Стаў народным і рок-гурт

ТЭКСТ

Алег МАЦВЯЙЧУК,
Шумілінскі райвыканкам

Штосьці новае заўжды нараджаецца на стыку агульных інтарэсаў. Прыклад: капітальны рамонт з карэннай мадэрнізацыяй Шумілінскай школы мастацтваў. Менавіта на ёй сышліся інтарэсы нашага аддзела, абласнога ўпраўлення і Шумілінскага райвыканкама. У выніку на аб'екце асвоена ўжо дзесьці чатыры з паловай мільярды рублёў. Здача запланавана на пачатак новага навучальнага года. Ужо цяпер добра бачна, што аналагічнага па прыгажосці будынка на Віцебшчыне пакуль няма. І наша ДШМ таго вартая: тут працуюць пяць аддзяленняў, вучацца 375 дзяцей, для якіх неўзабаве адкрыюцца якасна новыя магчымасці творчай самарэалізацыі...

Часта задумваюся над тым, а **хто ўносіць большы ўклад у развіццё раённай культуры**: бібліятэкары ці клубныя работнікі. Але зноў і зноў прыходжу да высновы: іх дзейнасць варта разглядаць толькі ва ўзаемадзеянні. Маю на ўвазе згаданы ўжо стык агульных інтарэсаў, адкуль і бярэ адлік наша творчая дзейнасць. Для мяне вёска толькі тады жывая, калі апрача крамы мае клуб і бібліятэку. Таму не спяшаемся з аптымізацыяй. Так, на 15-20 працэнтаў там-сям зніжаецца працоўная нагрузка, але імкнёмся пакінуць ранейшую сетку нашых устаноў. Тым больш, што кадраў у нас хапае. Прынамсі, вакансій не маем.

Асноўная задача аддзела — задавальненне культурных патрэб усіх без выключэння ўзроставых катэгорый. Займаемся гэтым планамерна, з года ў год. Менавіта таму ў раёне — 145 аматарскіх фарміраванняў, дзе заняты 1 560 удзельнікаў; 15 народных і 5 узорных самадзейных калектываў. Летась народным у нас стаў нават рок-гурт "Эксперымент 12". Словам, імкнёмся крочыць у нагу з часам. Моладзь задаволена.

Не ходзім з працягнутай рукой. 80 мільёнаў рублёў выдаткавалі вобласць і раён на набыццё касцюмаў ды інструментаў для барабаншчыц: іх урачыстае шэсце ўпрыгожвае выступленні нашага духавога аркестра. Ён нядаўна прывёз з Лепеля, дзе праходзіў абласны конкурс "духавікоў", аж пяць лаўрэацкіх дыпломаў...

Часта задумваюся над тым, а хто ўносіць большы ўклад у развіццё раённай культуры: бібліятэкары ці клубныя работнікі. Але зноў і зноў прыходжу да высновы: іх дзейнасць варта разглядаць толькі ва ўзаемадзеянні. Маю на ўвазе згаданы ўжо стык агульных інтарэсаў, адкуль і бярэ адлік наша творчая дзейнасць. Для мяне вёска толькі тады жывая, калі апрача крамы мае клуб і бібліятэку. Таму не спяшаемся з аптымізацыяй. Так, на 15-20 працэнтаў там-сям зніжаецца працоўная нагрузка, але імкнёмся пакінуць ранейшую сетку нашых устаноў. Тым больш, што кадраў у нас хапае. Прынамсі, вакансій не маем.

Тут вялікую справу робіць наша ДШМ. Менавіта адсюль пасля выпуску прыходзяць да нас музыканты-выкладчыкі, мастацкія кіраўнікі харавых, танцавальных ды інструментальных калектываў... Пастаянна кантактуем з музычнымі каледжамі Віцебска і Наваполацка. Сёлета да нас прыязджаюць дзевяць спецыялістаў: духавікі, цымбалісты, акардэаністы, дамбрысты і піяністы.

Калектыў у нас — высокапрафесійны, умовы працы — спрыяльныя. Як правіла, юнакі і дзяўчаты ў нас застаюцца. Прыкладна палова кадраў — свае, дамарослыя, астатнія — прыезджыя. Да прыкладу, летась прынялі пяць такіх работнікаў. Яны на сёння — у ліку лепшых і яркіх нашых спецыялістаў, якія задаюць тон, не даюць нікому супакоіцца, здзіўляюць ідэямі як сцэнарысты ды як рэжысёры. І ўвогуле пераконваюся, што апошнім часам у сферу рэгіянальнай культуры прыходзяць абсалютна невыпадковыя людзі. Заслуга ў гэтым належыць вышэйназваным сярэднім спецыяльным установам, якія нястомна адшукваюць таленавітых абітурыентаў...

Інакш кажучы, ведаем, куды нам рухацца. Пры гэтым мы не прывыклі скардзіцца на нейкія праблемы. Па маім цвёрдым перакананні, прафесіяналы павінны ўсведамляць, што праблемы — неад'емная частка любой працоўнай дзейнасці. А вось іх аператыўнае і выніковае рашэнне — неад'емны складнік любой творчай натуры.

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце на
facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby

Фестывальны гід

Як Александрыя сабрала сяброў

Тры кірмашы на адным свяце

Моманты свята ў Александрыі. / Фота аўтара

5 — 6 ліпеня ў вёсцы Александрыя Шклоўскага раёна чарговы раз прайшло рэспубліканскае свята "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў").

Купалле — чароўнае і, безумоўна, самае прыгожае свята беларускага народнага календара. Гэта час найбольшага росквіту прыроды, калі зямля дыхае сілай, перадаючы сваю энергію ўсяму жывому. Менавіта на Купалле зёлкі маюць асаблівыя гаючыя ўласцівасці, вада ператвараецца ў цудоўны эліксір маладосці, агонь атрымлівае вялікую ахоўную і ачышчальную моц, а кожнае слова, прамоўленае ўслых, робіцца замовай... Яшчэ адна рыса, уласцівая Купаллю: яно ніколі не адзначаецца ў адзіноце. Вось і свята ў Александрыі, па задуме арганізатараў, праходзіла пад дэвізам "Днепр — рака сяброўства!". Для гэтага ёсць падстава: з даўніх часоў Днепр звязвае тры славянскія народы — беларускі, рускі і ўкраінскі, таму па традыцыі ў свяце прымалі ўдзел майстры і творчыя калектывы з Расіі і Украіны.

Адной з галоўных дзей свята стаў Александрыйскі кірмаш, на якім адбылася шумная, пярэстая "сустрэча трох...": Сарочынскага кірмашу, што аб'яднаў пад святочным небам вытворцаў з Украіны (Чарнігаў, Чарнаўцы і Цярнопаль), Ніжагародскага кірмашу, які з'яўляецца своеасаблівай "візітоўкай" Расіі (майстры з Ніжагародскай, Калінінградскай, Смаленскай абласцей), і беларускага — Александрыйскага.

Беларускі кірмаш, паводле задумы арганізатараў, меў на мэце найперш паказаць вялікае багацце беларускай дэкаратыўна-прыкладной і фальклорна-абрадавай культуры. Пры ўваходзе гасцей па традыцыі чакалі хлеб ды соль. Кожнаму, хто набываў духмяны купальскі каравай, хлебапёкі абяцалі здароўе, шчасце і багацце на цэлы год!..

Калі пшанічны і жытнёвы хлеб заўсёды вяршэнствавалі на беларускім стале, то другое пачэснае месца ўжо даўно замацавалася за бульбай. На творчай пляцоўцы "Гасцёўня бульбаша" клубнымі ўстановамі Шклоўскага, Хоцімскага, Краснапольскага і Глускага раёнаў ладзілася свята беларускай бульбы. Тут прайшлі конкурсы па намінацыях "Арыгінальная страва", "Лепшы аб'ёмны тэатральны касцюм", "Лепшая гульнёвая праграма на тэму "Беларуская бульба", "Лепшая прыпеўка, прысвечаная беларускай бульбе".

Міні-свята "Чароўныя карункі" прадставіла для гасцей "Купалля" экспазіцыю работ майстроў па вышыўцы, ткацтве, карункапляценні, вырабе тэкстыльнай лялькі. Выстаўка майстроў вобласці знаёміла гледачоў з беларускім ручнікам і рэгіянальнымі строямі Магілёўшчыны. А ў тэматычнай экспазіцыі "Залатая саломка" дэманстраваліся вырабы з "сялянскага золата" — саломкі: саламяныя цацкі, дэкаратыўныя пано, а таксама прадметы побыту ды інтэр'ерныя аб'екты, выробленыя з саломкі або аздобленыя ёй.

На міні-свяце "Глушанскі хутарок" увазе наведвальнікаў быў прадстаўлены багаты асартымент вырабаў керамістаў Бабруйскага, Клімавіцкага, Чавускага, Крычаўскага раёнаў: сталовы посуд, а таксама сувеніры з гліны, сярод якіх значнае месца займалі свістулькі — старадаўні славянскі абярэг. Часцей за ўсё на кірмашы сустракаліся гліняныя коні і птушкі, бо, як вядома, конь здаўна лічыцца сімвалам шчасця, сонца, а фігуркі птушак з'яўляюцца сімвалам хатняга агменю і дабрабыту.

Пляцоўка "Сялянскі двор" клубных устаноў Касцюковіцкага, Слаўгарадскага, Дрыбінскага, Магілёўскага раёнаў уяўляла з сябе рэканструкцыю вялікага сялянскага двара. Тут можна было пазнаёміцца з побытам беларускай хаты, атрымаць майстар-клас па вырабе кошыкаў, сурвэтак, лыжак. Наведвальнікам "Сялянскага двара" сваё ўнікальнае майстэрства дэманстравалі шапавалы з Дрыбіншчыны. Сыравары са Слаўгарадскага раёна ад душы частавалі гасцей, а побач разгарнулі гандаль разьбяры па дрэве. Шчыравала і "Гусінае свята", а непадалёк арганізавалі выстаўку-продаж жывой прадукцыі жывёлагадоўчых, птушкагадоўчых і рыбных гаспадарак краіны. Тут жа госці свята маглі набыць купальскі вянок з жывых кветак, прадэгуставаць беларускія стравы, прыняць удзел у фальклорных гульнёва-забаўляльных праграмах.

Святу ў Александрыі прысвечаны і "Фотасюжэт нумара" **на старонцы 3.**

У канцэртнай праграме "Александрыя гасцінна вітае сяброў", якая прайшла на Малой святочнай сцэне, прынялі ўдзел творчыя калектывы "Родники" (горад Сямёнаў на Ніжагародчыне), "Червона калина" (украінскі Чарнігаў), "Дюзава" (малдаўская Гагаузія) і фальклорныя калектывы Магілёўшчыны.

На другі дзень свята адбыўся тэматычны канцэрт "Купальскі карагод", дзе свае праграмы прадставілі творчыя калектывы Расіі, Украіны і нашай Магілёўшчыны. Таксама ў канцэрце прымалі ўдзел актыўныя ды таленавітыя сем'і вобласці — удзельнікі абласнога агляду-конкурсу сямейнай творчасці "Жывіце ў радасці!" (у яго рамках радзіны спаборнічалі не толькі ў сцэнічным майстэрстве, але і ў намінацыях "Сям'я-рукатворніца", "Гасцінны каравай", "Хай льецца песня і прыпеўка!" і "Музычная скарбонка").

Алена БЕЛАНОЖКА,
вядучы метадыст Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы

Пасольства Беларусі ў Францыі 3 ліпеня зладзіла **беларускі вечар**, прысвечаны Дню Незалежнасці і святу Купалля.

"Вашы акцёры не бачылі **рэальнага жыцця"**

Дваццаць французаў пераехалі б у Бабруйск...

Выключна французскі шарм і еўрапейская непасрэднасць увасобіліся ў звычайнай майцы і лёгкіх штанах (аніякіх табе турбот наконт знешняга выгляду!)... Так сустракаў мяне рэжысёр з Францыі Фабрыс КАРЭЙ. Нягледзячы на спякоту майскага Мінска, мы пагутарылі пра французскі і беларускі тэатры. У чым іх розніца і што іх яднае? І, увогуле, вечнае пытанне: дзе лепш?

Фабрыс КАРЭЙ, заснавальнік, мастацкі кіраўнік тэатральнай франка-беларускай асацыяцыі "Demain le Printemps" ("Заўтра вясна")

Асацыяцыя, якой кіруе Фабрыс, заснавана ў Парыжы дваццаць гадоў таму. Яна аб'ядноўвае французскіх і беларускіх акцёраў ды выкладчыкаў тэатральнага мастацтва ў працы над ажыццяўленнем франка-беларускага культурнага абмену ў галіне тэатра.

— Як жа трапілі ў Беларусь?

— Апынуўся тут у 1993 годзе. У Парыжы прымаў беларускіх журналістаў. Яны мне распавялі пра Акадэмію мастацтваў, і мяне гэта зацікавіла. Неўзабаве яны даслалі мне запрашэнне — і я паехаў. Першае, што ўбачыў у Акадэміі, — чарнавы варыянт дыпломнага спектакля "Лысая спявачка" (Лідзія Манакова запрасіла Мікалая Пінігіна на тую пастаноўку). Гэта было геніяльна! Я падумаў: ну, я, напэўна, больш чым на год застануся тут. І вось адразу паступіў на трэці курс, таму што ўжо правучыўся два гады ў кансерваторыі ў Францыі. Па-руску ведаў толькі словы "да", "нет", "водка", "перестройка".

— Досыць стэрэатыпна...

— Нічога не разумеў у вашым жыцці. Я жыў у інтэрнаце. Аднойчы іду раніцай у Акадэмію і бачу, што ў краме ёсць яйкі і сыр. Выдатна! Увечары вяртаюся — ні яек, ні сыру. Потым я зразумеў, што трэба ўстаць у чаргу. З раніцы яйкі ўбачыў — стаў у чаргу. Паўгадзіны прастаяў, а прадавец не хоча мне яйкі даваць! Я нічога не зразумеў! Толькі потым да мяне дайшло, што патрэбны талоны, якія тады былі ў абарачэнні...

— Ці не захацелася адразу ж ірвануць назад у Францыю?

— Не! Потым я хадзіў на заняткі, нічога не разумеючы, рабіў усё, што мне казалі. Але ж я бачыў той спектакль, ведаў, што калі рабіць, як кажуць, то можна дасягнуць такога. Трэба проста слухаць. І павінна быць мэта.

— Да прыезду ў Беларусь у вас былі ролі, вы спрабавалі сябе як рэжысёр?

— Вядома ж. Але ў нас там крыху іншая школа. Яна пачыналася з Мальера. Тады малады акцёр вучыўся капіраваць свайго майстра. Калі ён пачынаў іграць ужо лепш за апошняга, з'яўлялася свабода: ён пачынаў тварыць. Сістэма Станіслаўскага, якая распаўсюджана ў Расіі і Беларусі, — гэта трошкі іншае. У нашай школе больш ад копіі, ад інтанацыі, шмат — ад тэксту. Мы бяром партытуру ролі, добра вывучаем яе, а потым пачынаем іграць. Але таго недастаткова, каб заяўляць пра школу. Наогул, у Францыі няма фармату, па якім можна вучыць мастацтву, няма акадэмічнай формы, няма плана, дзе распісаны этапы навучання. У нас часам які-небудзь дзядзечка можа адпусціць сабе бараду і сказаць, што ён вучань Таўстаногава. І вуаля — ён акцёр!..

— Падаецца, у Францыі і без таго шмат акцёраў ды значная канкурэнцыя?

— Велізарная! Дужа шмат людзей хоча быць акцёрамі, і маецца багата разнастайных школ ды методык. Так, пры наяўнасці 350 прафесійных профільных школ, існуе толькі адзін тэатр, эквівалентны вашым нацыянальным рэпертуарным трупам: "Камедзі Франсэз". Астатнія — прыватныя, якія толькі часам атрымліваюць гранты ад Урада.

— У Беларусі існуе паказчык сярэдняй запаўняльнасці глядзельнай залы...

— Дзяржава дае грошы, каб развіваць тэатр, спансіруе яго: робіць рамонт, плаціць зарплаты. Для чаго? Каб прыйшоў глядач! Навошта дзяржаве, каб зала была пустой? Гэта зразумелы ход. У нас — тое ж самае. Вы хочаце зрабіць спектакль — вам патрэбен спонсар. Спонсар кажа: "Я хачу, каб вы паставілі такую і такую п'есу", а калі вы хочаце іншую — ён не дае грошай. Пляцовак — мноства. Маленькая трупа хоча іграць спектакль на сцэне — заплаці за арэнду і выконвай. Некаторыя прадзюсары робяць камерцыйныя праекты, запрашаюць кіназорак, ставяць бойкія камедыі, разгортваюць рэкламу. Нацыянальнай жа сцэне дзяржава дае грошы, агаворваючы ўмовы: "У гэтым месяцы ставіць спектакль будзе такі рэжысёр". Апошні набірае акцёраў, рэпеціруе, паказвае спектакль — і да пабачэння. Ёсць асобныя трупы, якія атрымліваюць грошы. Напрыклад, Тэатр Арыян Мнушкінай — гэткі "міні-"Камедзі Франсэз".

У Беларусі існуе дзяржаўная стратэгія, і ўсе ведаюць, у чым яна заключаецца. Можна выказвацца, спрабаваць нешта змяніць, усё адкрыта. А ў нас у кожнага спонсара — свая стратэгія. Гэта адна з прычын таго, што нашым акцёрам вельмі цяжка знайсці працу.

Колькі слоў пра тэатральную адукацыю. У вашых студэнтаў заняткі — з раніцы да ночы. Але затое ў іх ёсць усе прадметы. У нашай школе галоўнае — мова, тое, што мы называем "арт драматык". А тэатральнага майстэрства практычна няма: яно ўключана ў комплекс сцэнічнай мовы. І няма вакалу, танца. У некаторых школах іх выкладаюць, але — за вялікія грошы. Атрымліваецца, наша школа — гэта 20 гадзін у тыдзень. Яшчэ столькі ж вы будзеце працаваць дзе-небудзь, каб аплаціць вучобу. У выніку, ваш мозг не настроены цалкам на тэатр. І ні адзін банк не будзе даваць студэнту грошы на вучобу. Калі малады чалавек хоча стаць урачом, то банк спакойны, ён разумее, што ён свае грошы акупіць. Ведаеце, я думаю, можна знайсці дваццаць французскіх акцёраў, якія пагадзіліся б прыехаць у Бабруйск і жыць ва ўмовах, у якіх жывуць вашы акцёры. І яны былі б шчаслівыя проста працаваць! Ёсць дах, святло, магчымасць тварыць — гэта галоўнае.

Фабрыс Карэй: "У нашай школе галоўнае — мова, тое, што мы называем "арт драматык". **А тэатральнага майстэрства практычна няма**: яно ўключана ў комплекс сцэнічнай мовы. І няма вакалу, танца. У некаторых школах іх выкладаюць, але — за вялікія грошы".

— Ну, грошы акцёрам таксама патрэбны...

— Вашы акцёры не бачылі рэальнага жыцця. Праца яго стварае. А калі ён увесь час шукае тую працу, значыць, ён ужо і сам сабе агент. Дарэчы, на тэатры ў нас практычна ніхто не заробіць грошай. Большасць людзей чымсьці паралельна займаецца. Здаецца, самыя лепшыя павінны зарабляць, але гэта не заўсёды так.

— Што цяпер у Францыі больш за ўсё ставяць? Камедыі?

— Прыватныя тэатры больш займаюцца камедыямі. Дзяржаўныя праекты — сучаснымі пастаноўкамі або класікай (французскай, сусветнай). У французаў асаблівая любоў да рускай культуры: да Чэхава, Дастаеўскага…

— А вашы ўлюбёныя драматургі?

— У мяне іх шмат. Напэўна, у першую чаргу, гэта Чэхаў і Мальер.

— Вы чыталі што-небудзь з беларускіх драматургаў?

— Не, але я глядзеў спектакль "Пан Тадэвуш" у Купалаўскім тэатры. Гэта спектакль вельмі высокага ўзроўню. Ён ішоў і ў Парыжы 18 чэрвеня з субцітрамі…

— Купалаўскі тэатр і "Вяселле" вазіў у Парыж ...

— Але паказалі спектакль не ад імя Тэатра імя Янкі Купалы, а ад імя рускай трупы. Французы яго ўспрынялі не як беларускі праект. Крыўдна, я ж разумею, наколькі важна, каб людзі ўсведамлялі, што перад імі — менавіта беларускі тэатр. У якой краіне нарадзіліся гэтыя акцёры? У Беларусі! Хто зрабіў з іх такіх прафесіяналаў? Акадэмія і Купалаўскі тэатр. Таму што без тэатра не можа быць акцёра. Школа дае зерне, але потым трэба, каб акцёр яго вырасціў. Праз пяць-дзесяць-пятнаццаць гадоў чалавек робіцца выбітным акцёрам.

— Фабрыс, што наконт вашых праектаў на будучыню?

— Галоўная задача — падзяліцца досведам наяўнай у Беларусі тэатральнай школы. Мы хацелі б пасупрацоўнічаць з Кітаем, зрабіўшы тэатральны абмен. І яшчэ ёсць жаданне арганізаваць культурны абмен, але ўжо для рускамоўных акцёраў.

— Вы жывяце паміж Мінскам і Парыжам увесь час... Мне здаецца, ці ў вас ужо дзве душы?

— Я не магу выбраць. Аднолькава добра мне і там, і там. Я ніколі не з'язджаю — я заўсёды вяртаюся, а ў сваім нататніку не пішу: "З'язджаю ў Парыж". Пішу: "Вяртаюся ў Мінск", "Вяртаюся ў Парыж". Я заўсёды на Радзіме. Люблю і Францыю, і Беларусь…

Паліна ПЛАТАВА, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ

фотафакт

Адна дынастыя

У чэшскім горадзе Тржэбіч на гэтым тыдні адкрылася выстаўка работ мастакоў трох пакаленняў з творчай дынастыі Масленікавых. Экспазіцыя, куратарам якой стала жывапісец Аксана Аракчэева, прысвечана 100-годдзю з дня нараджэння народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі нашай краіны Паўла Масленікава.

Культура пачалася з...

...імправізацый і школьнага хору

ТЭКСТ

Леанід НАРУШЭВІЧ, музыкант, лідар гурта "Князь Мышкін"

Па шчырасці, з культурай у мяне не заладзілася з самага пачатку. А вось з музыкай…

Хросны падарыў мне маленькі дзіцячы баянчык, калі мне было гады тры. Я спрабаваў нешта з яго "выняць", мабыць, нават нешта спяваў, таму што да гэтага часу памятаю пах яго мяхоў і зялёную перламутравую абіўку. Затым у другім класе мінскай СШ № 123 мяне не ўзялі пасля папярэдняга праслухоўвання ў музычную школу. Мабыць, чагосьці дзесьці не дацягнуў, не змог, не зразумеў. Але ў трэцім класе, дзякуючы настаўніку спеваў Руслану Беламу (ён, дарэчы, быў кампазітарам, пісаў музыку для дзяцей), спяваў у школьным хоры да таго часу, пакуль не зламаўся мой высокі голас. Але ўжо тады больш за патрыятычныя піянерскія песні, якія я выконваў з дзяўчатамі-харавічкамі, мне падабаліся выступленні школьнага ВІА на тамтэйшых святах. Яго ўдзельнікі падаваліся проста нейкімі суперлюдзьмі! Яны выконвалі, як цяпер прынята казаць, каверы на "Песняроў", "Beatles" і песні ўласнага сачынення.

А ўлетку 1975-га ў Ракаве я выпадкова пачуў, як мясцовы віртуоз Юхавіч грае на мандаліне польскія ды беларускія мелодыі. І вось тут я ўжо "захварэў" па-сапраўднаму. Бабуля выкупіла ў яго за дваццаць рублёў маленькую мандаліну, а далей я набыў у краме "Музыка" сяміструнную гітару і пачаў складаць уласныя немудрагелістыя песенькі. У 1979-м у вучылішчы кінамеханікаў паспрабаваў стварыць свой першы ансамбль, а ў 1983 годзе, сумесна з Сяргеем Дудніцкім, сабралі першы рок-склад і назвалі яго "Інтэр".

Бабуля выкупіла за дваццаць рублёў маленькую мандаліну, а далей я набыў у краме "Музыка" сяміструнную гітару і пачаў складаць уласныя немудрагелістыя песенькі.

У 1989 годзе я нейкім чынам апынуўся ў гурце "Зарціпо", дзе мы пачалі замест песень запісваць свае імправізацыйныя рэпетыцыі. І так мне гэта спадабалася — імправізаваць, — што з 1991 года ўжо ў створаным мной калектыве "Князь Мышкін" шчасна займаюся такой справай да сённяшняга часу.

Нельга сказаць, што калектыў прымаюць і разумеюць на нашых прасторах. Але дзякуючы Інтэрнэту ды настойлівасці "Князь Мышкін" гастралюе і запісвае свае, па большай частцы — канцэртныя, выступленні. Атрымалася выступіць на фестывалях у Чэхіі і Польшчы, Літве і Латвіі, Украіне і Расіі. Дый на перспектыву "планаў громадзьё". Было б цікава пайграць яшчэ і ў мясцовых "філармоніях", але ўжо, мабыць, не задалося з самага пачатку…

Мабільная бібліятэка МТС у супрацы з Нацыянальнай бібліятэкай папоўнілася **копіямі выданняў ваеннага часу**.

Фатаграфічная калекцыя

Фота на дакументы

40 кадраў — 80 абліччаў. Статычныя побытавыя здымкі літоўскага фатографа Вітаўтаса Станёніса з адзінай няспаленай самім аўтарам плёнкі. Выпадкам яна захавалася і вяртае ў год 1946-ты, калі ў Літве ўводзілі пашпарты. Так, тыя 40 кадраў — будучыя 3х3,5 см: фота на дакументы (такая і назва выстаўкі ў Галерэі сучаснага мастацтва "Ў").

Сяргей ТРАФІЛАЎ

На кадрах няма эмоцый. Усё зразумела: прыехалі да месца здымкі з Сейрыяя і ваколіц, селі па двое перад камерай на белым, неідэальна нацягнутым, фоне, шчоўк — і вызвалялі месца для брата, суседа, маці з бацькам. Аўтар праекта — сын фатографа Вітаўтас В. Станёніс, што працуе над ім тры дзесяцігоддзі, — сустракаўся з трыма героямі гэтых кадраў, а таксама са шматлікімі родзічамі астатніх з іх. Здымку памяталі, але не ўсім запомніўся той "шчоўк". Затое няпросты пасляваенны час у літоўскай вёсцы не забывалі. А Станёніс-малодшы запісаў гэта. І тады пачаў бачыць нейкую затоенасць у вачах адных, ваўкаватасць — у другіх, насцярожанасць — у трэціх герояў здымкаў. Смелых поглядаў — мала... Ці наогул няма?

Поўнай серыю паказваюць нядаўна. Сын фатографа звяртае ўвагу на захаваную пры павелічэнні перфарацыю плёнкі на адбітках, што яшчэ раз сведчыць: кадры не маюць дачынення да мастацтва. Такія ж рабіла больш як 600 фатографаў, "рэкрутаваных" на здымку насельніцтва пад пашпартызацыю…

К

Два мільярды пасажыраў у… Гродне

Гродзенскаму тралейбусу ў лістападзе — сорак гадоў. Першы яго маршрут пралёг паміж Савецкай плошчай і знакамітым "Азотам". Цяпер агульная працягласць тралейбуснай лініі — каля 80 кіламетраў. Калі за год мясцовыя тралейбусы перавозяць блізу 80 мільёнаў пасажыраў (штодня на 17 маршрутах працуе 119 машын), то за час існавання гэтага транспарту ў сталіцы Панямоння ім скарысталася больш за 2 мільярды 344 мільёны чалавек.

Першым мог быць трамвай…

Адмыслова да гэтай даты ўжо некалькі месяцаў па Гродне курсіруе рэтра-тралейбус: яго салон афармлены як міні-музей па мінуўшчыне горада. А пра гісторыю з'яўлення такога віду грамадскага транспарту ў Культурнай сталіцы Беларусі распавядае краязнаўца, аўтар кнігі пра гісторыю сродкаў камунікацыі ў Гродне Віктар Саяпін:

— Яшчэ напрыканцы 20-х у Гродне мог з'явіцца электратранспарт. Як паведаміла ў 1928-м газета "Новае жыццё", Бельгійскае трамвайнае таварыства прапанавала магістратам Беластока і Гродна адкрыць у гарадах трамвайны рух. Па якой прычыне ў апошнім не з'явіўся трамвай, звестак бракуе. І вось толькі ў 1965 годзе, упершыню на ўзроўні ўлад горада і вобласці, было ўзнята пытанне будаўніцтва тут тралейбуснай лініі.

Аднак, паводле шэрагу крыніц, яшчэ ў час акупацыі Кіева ў гады Другой сусветнай вайны немцамі са сталіцы Украіны былі вывезены тралейбусы ў Кенігсберг, Познань, Беласток і Гродна. Верагодна, там планавалі адкрыць тралейбусны рух. Пасля ж вызвалення Гродна савецкімі войскамі прывезеныя ў наш горад машыны вярнулі ў Кіеў…

Траса зацверджана, каб… змяніцца

— Тым не менш, — працягвае Саяпін, — толькі 25 верасня 1965-га гарвыканкам прыняў рашэнне аб праектаванні і ўвядзенні першай чаргі тралейбуснай лініі па маршруце "АТЗ — ХПФ (баваўнянапрадзільная фабрыка)" з трасай па праспекце Касманаўтаў, вуліцах Леніна, Ажэшка, Дзяржынскага, 17 верасня, Горкага ў прамым напрамку і па вуліцах Горкага праз плошчу Леніна, вуліцы Сацыялістычную, Маркса, праспект Касманаўтаў у зваротным. Цікава, што праекцыроўшчыкі, як бачым, прапаноўвалі пусціць тралейбус па вуліцах Ажэшка, Леніна і 17 верасня. І нават амаль праз паўстагоддзя тралейбус па гэтых вуліцах… так і не прайшоў, ды, урэшце, і не мелася ў тым пільнай неабходнасці.

Аднак толькі праз сем гадоў уладамі былі зроблены канкрэтныя крокі па непасрэдным будаўніцтве тралейбуснай лініі. 16 студзеня аблвыканкам зацвярджае заданне і зводны каштарыс, адпаведна якому першая чарга работ абышлася бюджэту агулам у 2 475,43 тысячы рублёў. Працягласць лініі склала сем кіламетраў, а тралейбуснае дэпо прадугледжвала месцы для сотні машын. Таксама 1 чэрвеня 1974-га было ўтворана Гродзенскае тралейбуснае ўпраўленне.

Першы, набыты піянерамі

Як вядома, савецкія людзі штогод да святаў 1 Мая і 7 лістапада атрымлівалі падарункі ў выглядзе ўводу ў эксплуатацыю аб'ектаў інфраструктуры. Так здарылася і 5 лістапада 1974-га, калі напярэдадні чарговай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі быў адкрыты першы ў Гродне тралейбусны маршрут: лінія працягласцю 8,5 км звязала цэнтр горада з найбуйнейшым прадпрыемствам — хімкамбінатам імя С.А. Прытыцкага. На ўрачыстае адкрыццё на Савецкай плошчы сабраліся сотні гродзенцаў, кіраўнікі горада і вобласці, прадстаўнікі тралейбуснага ўпраўлення і, вядома ж, будаўнікі будупраўлення № 64 трэста № 11, Гродзенскага ўпраўлення трэста "Белэлектрамантаж". Тады першы сакратар абкама кампартыі Леанід Кляцкоў перарэзаў стужачку, а першы тралейбус з надпісам "Піянерскі" павёў дасведчаны кіроўца Пётр Бубла. Яго пасажырамі сталі будаўнікі, госці горада і піянеры (на сродкі, атрыманыя апошнімі ад збору металалому, і набылі тую самую першую машыну).

Пра першыя савецкія тралейбусы ўзгадвае і гісторык Эдуард Дмухоўскі:

— Савецкія тралейбусы былі вельмі гучныя, але мы можам зараз з цеплынёй узгадаць, як ламіліся ў іх, каб заехаць на заняткі… Нас "заносілі" туды і "выносілі" адтуль…

Гродзенскі тралейбус на маршруце № 1.

Даведка

Першы тралейбус з'явіўся ў Германіі ў 1882 годзе ў выніку распрацовак братоў Сіменс. А курсіраваць у Еўропе пачаў у 1911-м — у мястэчку Чэшскія Будэёвіцы з насельніцтвам усяго 67 тысяч чалавек (па тым часе — Аўстра-Венгрыя). У Расіі ж першы тралейбус стварыў Пётр Фрэзе ў 1902-м, а праз два гады інжынер В.І. Шуберскі прапанаваў праект лініі "Новарасійск-Сухумі" (нягледзячы на істотную прапрацоўку, задума так і не была ажыццёўлена). Першую трасу ў СССР пабудавалі толькі ў 1933 годзе ў Маскве. Першымі ж тралейбусамі Саюза сталі машыны ЛК-1, названыя ў гонар Лазара Кагановіча. У 1938-м у Маскве эксплуатаваліся двухпавярховыя тралейбусы ЯТБ-3. Але першая ж зіма выявіла іх недахопы: снег і наледзь абцяжарвалі кіраванне транспартам і выклікалі яго разгойдванне. Дый вышыня тралейбуса была абмежавана вышынёй кантактнай лініі. Урэшце, у 1939-м выпуск ЯТБ-3 спынілі.

Чаму тралейбус па вуліцы Ажэшка так і не пайшоў?

Што ж да менавіта гродзенскіх тралейбусаў, то на сённяшні дзень яны пафарбаваны ў колер герба горада — жоўта-блакітны. Ім гэта вельмі пасуе. У іх, зазначу, гучыць беларуская мова…

І Фарты, і Фолюш

У студзені 1975 года будаўнікі атрымалі тэхнічную дакументацыю на будаўніцтва другой чаргі, згодна з якой гэты транспарт павінен быў прайсці па вуліцах Леніна, Акадэмічнай, 17 верасня, Горкага, Астроўскага і далей па вуліцы Маркса па наяўнай кантактнай лініі, а 29 снежня таго ж года яна была здадзена: адкрыўся маршрут № 2 ад Хімкамбіната да Прадзільна-нітачнага камбіната. Праўда, другая лінія, насуперак першапачатковаму праекту, была пракладзена па вуліцах Кастрычніцкай, Вялікай Траецкай, Віленскай, Горкага, Астроўскага, плошчы Леніна, Сацыялістычнай і далей уразалася ў наяўную. Праз год, з 1 лістапада 1976-га, былі арганізаваны тралейбусныя маршруты № 3 і № 4 працягласцю 16,2 км і 17 км "Хімкамбінат — Фарты" і "Дом сувязі — Фарты". У 1977 г. у эксплуатацыю здалі 10,8 км кантактнай сеткі і адкрылі маршрут працягласцю 22,3 км, у 1978-м — яшчэ два.

А сёння шляхі тралейбуса праходзяць праз Гродна ад самай крайняй кропкі на Заводзе будаўнічых матэрыялаў да ваеннага гарадка Фолюш.

Андрэй МЯЛЕШКА
Гродна

Калектыў Вялікага тэатра Беларусі выказвае шчырыя спачуванні намесніку генеральнага дырэктара Юрчанка Зоі Іванаўне і намесніку начальніка службы апрацоўкі і рэалізацыі білетаў Садзік Аксане Уладзіміраўне ў сувязі з напаткаўшым іх горам — смерцю мужа і бацькі.

Калектыў унітарнага прадпрыемства "Кінавідэапракат" Мінгарвыканкама глыбока смуткуе з прычыны заўчаснай смерці былога намесніка генеральнага дырэктара — галоўнага інжынера СКУГАРЭЎСКАГА Уладзіміра Анатольевіча і выказвае шчырае спачуванне яго родным і блізкім.

Праект сталічнай Галерэі твораў Л.Шчамялёва "Сталіца — рэгіёнам" прэзентуе суполку **кобрынскіх мастакоў** "Дэвайтыс".

Колеры Альгерда

Альгерд Малішэўскі… Цудоўны беларускі жывапісец-каларыст, адзін з нешматлікіх мастакоў, хто так таленавіта і віртуозна валодаў фарбамі на палатне, лічачы, што менавіта сапраўдны жывапіс — гэта перш за ўсё тое, што павінна выклікаць у гледача пачуццё аўтарскага "ўваходжання" пэндзля ў структуру палатна, каб яно стала не проста "афарбаванай карцінкай", а эмацыйным арганізмам, праз які свет успрымаецца жывым, паўнакроўным і непасрэдным.

Барыс КРЭПАК

Альгерд Малішэўскі.

Сёлета споўніцца роўна чвэрць стагоддзя, як Альгерд Адамавіч пайшоў з жыцця, а яму было ўсяго 67. Здавалася б, надзвычайны жывапісец, выдатны педагог, які аддаў Мінскаму мастацкаму вучылішчу лепшыя свае гады, актыўны грамадскі работнік, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі і проста чалавек, з якім, прынамсі, мне, заўсёды было цікава сустракацца ды падоўгу размаўляць "пра жыццё і творчасць", павінен быў сёння заставацца ў авангардзе беларускіх класікаў, якія па-сапраўднаму будавалі наша мастацтва ў яго лепшых узорах. Аднак, як гэта, на жаль, часта ў нас бывае, сёння ягонае імя, мо акрамя вучняў, мала хто ведае нават з маладога пакалення мастакоў і так званых рэалістаў, мадэрністаў ды іншых канцэптуалістаў. Дзякаваць богу, жывапісец Сяргей Альгердавіч Малішэўскі працягвае годна несці гэтую фамілію, хаця мала хто ведае, што ён — сын таго самага выдатнага, але напаўзабытага творцы, пра якога зараз ідзе гаворка…

Альгерд Малішэўскі аддана любіў жывапіс французскіх імпрэсіяністаў, любіў "барбізонцаў", паважаў Веранэзэ, Тыцыяна, Эль Грэка, Ван Гога, Дэрэна, Канстанціна Каровіна, асабліва — Сезана, лічыў іх эталонам для кожнага творцы. Памятаю, як ён у 1977-м упершыню наведаў Парыж. Вярнуўшыся, адразу ж патэлефанаваў мне дадому і запрасіў у сваю новую майстэрню, якая ўжо тады была ў нашым толькі што пабудаваным доме па вуліцы Сурганава, куды мастак пераехаў з невялічкай майстэрні, што размяшчалася ў мансардзе дома па Ленінскім праспекце (прыкладна побач з колішнім магазінам "Сінтэтыка").

Я, канешне ж, адразу да яго (там цяпер майстэрня Мікалая Кірэева). І толькі гаспадар адчыніў дзверы, тут жа пачаў усхвалявана распавядаць мне пра тое ўражанне, якое на яго зрабіла сустрэча з творамі гэтых майстроў. "Ведаеш, — казаў ён, — у Парыжы я канчаткова зразумеў, што сапраўдны жывапіс — гэта жывое даханне палатна, калейдаскоп светлавых эфектаў, свежасць першага ўражання… Гэта калі кожны сантыметр палатна, дакладна вывераны ў колеры, ведае сваё месца…" І толькі пасля гэтых слоў пляснуў рукамі ды павітаўся са мной…

На развітанне сказаў: "Яшчэ раз з'ежджу у Парыж — і можна памірацъ…" Цікава, што гэтую фразу потым, як успамінае Адам Глобус, ён абвясціў і сваім вучням у вучылішчы. Канешне ж, так жартаваў. Але ў Парыж, наколькі мне вядома, ён больш не ездзіў, а нечакана памёр напрыканцы лістапада 1989-га, проста на пероне мінскага вакзала, дзе сустракаў (ці праводзіў) кагосьці…

Што і казаць, Альгерд Адамавіч заўсёды імкнуўся да "ідэальнага", з яго пункта гледжання, народу і сучаснасці, тым праявам карэнных асноў народнага быцця, на якіх трымаецца чалавек з усёй яго веліччу. І першымі значнымі работамі на дадзеную тэму сталі цудоўны партрэт брыгадзіра-палявода Прыступчыка і кампазіцыя "Даяркі. Поўдзень".

Малішэўскі быў чалавекам актыўным, камунікабельным, красамоўным, апранаўся, як сапраўдны дэндзі, і таксама, як дэндзі, не спяшаючыся, у дарагім паліто ды дарагіх акулярах, ранічкай ішоў у майстэрню. Што да сваіх вучняў, дык іншым разам быў з'едлівы, бязлітасны да халтуры. Ён казаў: "Мы павінны закрываць дарогу тым, у каго за душой пуста, тым, адзіная мэта якіх — выскачыць на паверхню. Нельга быць жывапісу, пачынаючы з першых пейзажных эцюдаў 1950-х гадоў ды заканчваючы карцінамі і партрэтамі 1980-х. Ён стаў не толькі пейзажыстам ці толькі партрэтыстам. Ён абраў для сябе іншы шлях — спасціжэння жыцця, шлях, праверaны досведам Вялікай Айчыннай вайны і вострай памяццю пра яе. У работах гэтага мастака — чалавечы боль і радасць, спакойная ўпэўненасць і заўсёдная незадаволенасць, урачыстасць фарбаў міру і безабароннасць кволай душы… У ягоных палотнах "пра час і пра сябе" — уся неўтаймаванасць душы жывапісца, захапленне роднай зямлёй і яе людзьмі. Кажучы "высоким штилем", яго творы прысвечаны галоўнаму: спакойным, калі дылетантызм прыладжваецца да моды, каб быць падобным да наватарства…" Залатыя і заўсёды актуальныя думкі!..

Некаторыя яго афарызмы і прыдуманыя ім мянушкі калег увайшлі ў нефармальную, бытавую гісторыю беларускага мастацтва. І тут ён мала ў чым саступаў майстру падобных "афарызмаў" Івану Восіпавічу Ахрэмчыку. "Пухавіцкая акадэмія" — гэта пра тэатральна-мастацкі інстытут. Ён там жадаў выкладаць, але яго туды не ўзялі з-за ягонай прыхільнасці да "буржуазнага фармалізму", баяліся, што ён "не таму" навучыць студэнтаў, скіруе іх у бок ад сацрэалізму. Вось ён, мабыць, не мог гэтага дараваць чыноўнікам ад мастацтва. Слова "більда" ў адносінах да вялікай, але дрэннай карціны — таксама яго вынаходка. Мянушкі? Ну, вось, напрыклад, такія: "Крывалетаў" і "Семіручкаў" — пра мастакоў-сяброў Крываручку і Семілетава, "Проста Сеня" — пра Віктара Пратасеню, і г.д. У сваю чаргу, той жа Ахрэмчык, аксакал пэндзля, таксама выдатны вынаходнік мянушак, называў Малішэўскага "Мальберт Мадамавіч Умалішэўскі", намякаючы на яго заўзятую любоў да французскага жывапісу і не толькі, а хтосьці называў яго "Мальбертам Падрамнікавічам", так бы мовіць, бліжэй да прафесіі…

Так, ён у сваёй творчасці быў няўрымыслівым жыццялюбам. Дысгармоніі жыцця супрацьпастаўляў гармонію мастацтва, бедам — радасць чалавечага існавання, суровасці часу — цеплыню сваіх карцін. Ужо па адной ягонай рэчы — "Нашы мацяркі" — разумееш: гэта быў гуманіст. Ягоны яскравы, прыязны, нібыта насычаны сонцам, талент служыў людзям, іхнім спадзяванням і шчасцю. Яго творчасць — рухомая, свавольная, нечаканая. Нават такія "банальныя" сюжэты, як аператары МТЗ, Полацкі нафтаперагонны, будаўнікі Чыжоўкі ды сям'я брыгадзіра, мастак ператвараў у феерверкі фарбаў, жывую размову прыроды — у эфекты, што ствараюцца кантрастамі альбо гармоніяй колераў. Здаецца, ён забаўляўся, спалучаючы жоўтае з сінім, рудое з ліловым, чырвонае з зялёным, вохру з блакітным. Гуляў у колеры, як дзеці гуляюць у кубікі. Гэтая "гульня" была ягоным жыццём. Малішэўскі даў новую ролю колеру ў жывапісе, выявіў ягоную самастойную каштоўнасць. І знайшоў для сваіх лепшых палотнаў найяскравейшыя фарбы, вырашыў найскладанейшыя каларыстычныя рэбусы. І калі аднаго з карыфеяў Рэнесанса, які лічыў колер у карціне другарадным, а лінію — галоўнай, прымаць у якасці полюса, дык Малішэўскі — полюс супрацьлеглы.

А.Малішэўскі. "Чырвоная паляна", 1965 г.



А.Малішэўскі. "Мы вернемся", 1965 г.

Успамінаючы Малішэўскага праз чвэрць стагоддзя

З-пад яго крыла выйшлі такія сёння вядомыя выхаванцы Мінскага мастацкага вучылішча, як Георгій Скрыпнічэнка, Мікалай і Марыя Ісаёнкі, Генрых Ціхановіч, Рыгор Іваноў, Яўген Кулік, Юрый Хілько, Уладзімір Гладкевіч, Віктар Шматаў, Сяргей Салохін, Генадзь Грак, Сяргей Кухто, Уладзімір Адамчык (Адам Глобус). Дарэчы, Адам Глобус — мабыць, адзіны з ягоных вучняў, хто пакінуў вельмі цікавыя пісьмовыя ўспаміны пра свайго выдатнага настаўніка. Астатнія — толькі ў кулуарах і за кубачкам гарбаты могуць успомніць добрым словам настаўніка "нумар адзін", які прапрацаваў у вучылішчы амаль трыццаць гадоў. Напрыканцы 1960-х я некалькі разоў быў рэцэнзентам дыпломных работ выпускнікоў мастацка-педагагічнага аддзялення вучылішча, і, канешне, быў заўсёды побач з Альгердам Адамавічам, што давала мне магчымасць уважліва назіраць за ягонай педагагічнай дзейнасцю і ўступаць з ім у цікавыя дыялогі.

Так, Малішэўскага лаялі за "няўвагу" да малюнка, за "кампазіцыйную сырасць" у фігуратыўных палотнах. А мастак толькі адмахваўся і працягваў рабіць тое, што яму падабалася, г. зн., пісаць. "Мяне часта папракаюць: у цябе ўсё колер ды колер, — казаў мне ён. — А хіба існуе жывапіс без колеру? Колер — гэта вобраз. У кожным кавалачку палатна павінен спяваць жывапіс. Што ж да ўласна малюнка, то ён, як правіла, рэдка служыць у мяне самастойным выяўленчым сродкам".

Скажу шчыра, я не заўсёды быў задаволены карцінамі Малішэўскага, асабліва зробленымі на тэмы, як мне тады здавалася, далёкія ад яго прыроднай мастакоўскай "ментальнасці": вытворчасць, МТЗ, нафтавікі, медыкі, будаўнікі… Лічыў, яго канёк — пейзаж, нацюрморт і партрэт. А што да шматфігурных карцін, дык я думаў, што гэта — проста больш лёгкі шлях для таго, каб заключыць самавіты дагавор да той або іншай рэспубліканскай ці ўсесаюзнай "дацкай" тэматычнай выстаўкі, прымеркаванай да розных юбілейных дат. Так рабілі ўсе мастакі, незалежна ад іхніх жанравых прыхільнасцей. І таму "чыстыя" пейзажысты ды нацюрмартысты вымушаны былі маляваць буйныя палотны на тэмы рэвалюцыі, рабочага класа, калгаснага сялянства, пісаць партызанскія паходы і будаўнікоў "светлай будучыні". Я ўжо не кажу пра вобраз Леніна — па-мойму, правадыра не пісаў і не рысаваў толькі лянівы. Нават рускія "фармалюгі" Пятроў-Водкін і Філонаў не абышлі ўвагай гэтага чалавека-магніта і "карміцеля" мастакоў: за Леніна, нават не зусім удалага па вобразе, добра плацілі. А калі хто і пісаў яго, які прымаў парад чырвонаармейцаў на фоне Маўзалея, дык не страшна: давалі аўтару заўвагу, каб да наступнага выстаўкама "прыбраць Маўзалей", і… заключалі дагавор на вельмі значную суму...

К

Працяг аповеду пра Альгерда Малішэўскага — **у наступных нумарах "К".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".**
- **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".**
- **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Персанальная выстаўка **Аляксандра Рыжэўскага,** майстра разьбы па шкарлупіне яйка.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.
- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
- **"Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".**

Выстаўкі:
- Міжнародны праект **"Рэчы паміж жыццём і смерцю"** — з 17 ліпеня.
- Выстаўка **"Яны змагаліся за Беларусь. Азербайджанцы ў баях за Беларусь"** — да 27 ліпеня.
- Выстаўка **"Манеты Другой сусветнай вайны"** (са збору Калінінградскага абласнога гісторыка-мастацкага музея) — да 29 жніўня.
- Выстаўка **"Памяці Мінскага гета"** (афорты Лазара Рана з прыватнай калекцыі) — да 10 жніўня.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП



г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка карцін і асабістых рэчаў Віктара Цітова **"Мастацтва, абпаленае вайной"** — да 28 ліпеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Беларусь сакральная"** — да 27 ліпеня.
- Выстаўка фотаапаратаў **"Настальгія"** — да 31 ліпеня.

Ратуша
- Пастаянная экспазіцыя.

Інфармацыйна-касавы цэнтр
- Выстаўка **"Смак беларускай гісторыі"** — да 31 ліпеня.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка фатаграфій **"Мір стары — Мір новы"**

Слановая зала
- Выстаўка з прыватнай калекцыі І.Сурмачэўскага **"Дух часу і раскошы: мода і стыль 1820 — 1920-х гадоў"** — да 15 жніўня.

Партрэтная зала
- **"Выстаўка партрэтаў князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** (Германія) — да 16 лістапада.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра".**
- Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.

Акцыі:
- **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
- **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
- Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўкі:
- Выстаўка, прысвечаная вызваленню Беларусі, **"Дарогамі Вайны"** — да 19 ліпеня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:
- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
- Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстаўка:
- Выстаўка работ заслужанага дзеяча мастацтваў Літвы, мастака Пётры Сергіевіча **"За славу роднай стараны"** — да 23 ліпеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10.
- **"Back in BSSR / Ізноў у БССР"** (савецкі плакат 1940 — 1980-х гг., прадметы матэрыяльнай культуры) — да 14 верасня.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска:

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА



г. Мінск, пл.Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
- **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганаровану грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўкі:
- Карціна Уладзіміра Пасюкевіча **"Партрэт героя..."** (жывапісны партрэт, а таксама рэдкія ўзнагароды і дакументы ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны М.Савіцкага).
- Персанальная выстаўка фотаздымкаў Юрыя Іванова **"Па-за часам"** — да 3 жніўня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл.Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

Выстаўка:
- Выстаўка гістарычнага партрэта Юрыя Каралевіча **"Рэмінісцэнцыя".**

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
- Віртуальная гульня **"Карэтны майстар".**

УВАГА!
ІДЗЕ ПАДПІСКА - 2014
НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА"
ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875
ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
- **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры к. XIX — с. XX стст.

Выстаўка:
- **"Куфэрак: стагоддзе прыгажосці"** — рэканструкцыя касцюмаў XIX ст. — да 28 верасня.

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА



г. Мінск, пр-т Ракасоўскага, 49. Тэл.: 291 16 76.

Экспазіцыі:
- **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Л.Шчамялёва".**

Выстаўкі:
- Выстаўка жывапісу і роспісу па тканіне **"Кобрынская палітра"** — да 9 жніўня.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ



г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- **"Цмокі і васковыя фігуры"** (скульптуры драконаў і герояў фэнтазі, а таксама гістарычныя персанажы царскай сям'і Раманавых) — да 31 жніўня.
- Выстаўка франтавых лістоў салдатаў Вялікай Айчыннай, што падарылі нам Перамогу, — **"Праўда салдацкіх трохкутнікаў"** — да 27 ліпеня.
- Скарбы сусветнага жывапісу ва ўнікальнай калекцыі рэпрадукцый **Надзеі Лежэ** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь — да 7 верасня.
- Выстаўка-калекцыя самых прыгожых і знакамітых матылькоў свету **"Лятаючыя кветкі"** — да 17 жніўня.

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня".**
- **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:
- **"Кнігі, у якіх захоўваецца час..."** (лепшыя выданні сяр. XVII — пач. XX стст.) — да 27 чэрвеня.
- **"Класікі беларускага мастацтва".**

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 57 41.
- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі".**
- Лакальная экспазіцыя **"Ваенна-санітарны вагон"** — да 30 верасня.
- Выстаўка да 100-годдзя Першай сусветнай вайны **"Вялікая вайна"** — да 28 ліпеня.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
- Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна...".**
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст.".**
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны".**
- **"Прывітанне, раней-шая Ліда!".**
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.
- **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
- Выстаўка **"Як жылі нашы продкі".**
- Выстаўка **"Чарадзейны Куфар".**
- Выстаўка творчых работ выпускнікоў і выкладчыкаў мастацкай школы **"Сустрэча пакаленняў".**
- Персанальная выстаўка П.Цімафеева **"Драматычнасць сярэдняга плана. Час жывых".**
- У рамках праекта "Выток Нёмана — выток духоўнасці" — калектыўная выстаўка **"Абуджэнне".**
- Выстаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці А.Чуўюравай (Сярко) **"Частка маёй душы".**
- **"Вайны свяшчэнныя старонкі"** — выстаўка, прысвечаная Вялікай Перамозе.
- Фотавыстаўка С.І. Котава **"Праўнукі Перамогі".**

ЛІДСКІ ЗАМАК

- Камера катаванняў.
- Фотавыстаўка **"Захаваем на вякі".**
- Партрэтная галерэя вялікіх князёў і каралёў.
- Фотавыстаўка **"Археалагічныя знаходкі Лідскага замка".**
- Выстаўка рэплік **"Зброя Вялікага Княства".**

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 288 15 49.
- Выстаўка твораў Ігара Уласава **"Каханне да жыцця"** — да 13 ліпеня.
- Выстаўка, прысвечаная 70-годдзю вызвалення Беларусі, **"Святло Перамогі"** — да 13 ліпеня.
- Персанальная выстаўка **Мікалая Бандарчука** — з 18 ліпеня.
- Персанальная выстаўка **Ніны Кавалёвай** — з 18 ліпеня.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 327 60 81.
- **14 — "Местачковае кабарэ"** (спектакль у 2-х дзеях).
- **15 — "Дон Жуан"** Ж.-Б. Мальера.
- **16 — "Вечар"** А.Дударава.
- **17 — "Офіс"** І.Лаўзунд.
- **18 — "Пінская шляхта"** В.Дуніна-Марцінкевіча.

На Малой сцэне Канцэртнай залы "Мінск"
- **18 — "Самотны захад"** М.МакДонаха.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.
- **14 — "Кантракт"** Ф.Вэбера.
- **16, 17 — "Фінт-Круазэ"** Д.Багаслаўскага, В.Красоўскага.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.
- **13 — "Блакітная камея"** (спектакль ідзе без аркестра) К.Брэйтбурга.
- **14 — "Граф Люксембург"** (аперэта ў 2-х дзеях) Ф.Легара.
- **15 — "Мая жонка — ілгуння"** В.Ільіна, В.Лукашова.
- **16 — "Вестсайдская гісторыя"** (мюзікл у 2-х дзеях).
- **17 — "Тысяча і адна ноч"** (аперэта ў 2-х дзеях) Ф.Амірава.
- **18 — "Містар Ікс"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Кальмана.

ШТОТЫДНЁВАЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Рэдакцыя

Рэдактары аддзелаў:
Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН

Аглядальнікі рэдакцыі:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Спецкарэспандэнты:
Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Вольга НАВІЦКАЯ

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — **Юрый ІВАНОЎ**

Мастацкі рэдактар — **Наталля ОВАД**

Карэктар — **Інга ЗЕЛЬГІС**

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.

Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by

E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2014. Індэксы 63875, 638752
Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Наклад 6316
Падпісана ў друк 11.07.2014 у
Замова 2919

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва" 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Прыёмная: (017) 290 22 50.
Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35